Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

ЖНІВЕНЬ 30 1932 г. № 194 (4446). Год выдаўня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Сеньня у нумары

АБ НАВУЧАЛЬНЫХ ПРАГРАМАХ І РЭЖЫМЕ У ПАЧАТКОВАЙ І СЯРЭДНЯЙ ШКОЛЕ — пастанова ЦК УсеКП(б) (1 стар.).

ПРА САМААБКЛАДАНЬНЕ СЕЛЬСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА — пастановы ЦВК і СНК СССР і ЦВК і СНК БССР (2 стар.).

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Выканаць плян збожжазагатовак! Ул. ЭЛЬ, ДАЛЬ — Як у Сіроціне знайшлі «клясавага ворага» (4 стар.).

II ПЛЕНУМ ЦСПСБ — Па-бальшавіцку змагацца за далейшую перабудову прафработы (3 стар.).

Аб ходзе падрыхтоўкі да прызыву 10 году нараджэньня (2 стар.).

Падсолніных і Татаржыцкіх—на лаву падсудных (2 стар.).

Уласную харчовую базу — кожнай калгоўцы (3 стар.).

Заводзкія арганізацыі «Камунара» і «Ударніка» аслабілі змаганьне за ажыцьцяўленьне 6 умоў т. Сталіна (3 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

Вайна падпальшчыкам імпэрыялістычнай вайны. (4 стар.).

АБ НАВУЧАЛЬНЫХ ПРАГРАМАХ І РЭЖЫМЕ Ў ПАЧАТКОВАЙ І СЯРЭДНЯЙ ШКОЛЕ

Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 25 жніўня 1932 г.

ЦК УсеКП(б) устанаўляе, што ў галіне пачатковай і сярэдняй школы па РСФСР за апошні год адбыліся значныя зрухі ў сувязі з увядзеньнем усеагульнага абавязковага навучаньня, пераходам да сыстэматычнага ўсваеньня навук на аснове пэўных навучальных плянаў, праграм і раскладаў. Аднак, яшчэ ня зьнішчан да канца карэнны недахоп школы, які заключаецца ў тым, што «на вучаньне ў школе не дае выстарчальнага аб'ёму агульна-асьветных ведаў і нездавальняюча вырашае задачу падрыхтоўкі для тэх нікумаў і для вышэйшай школы зусім пісьменных людзей, якія добра ўладаюць асновамі навукі (фізыка, хэмія, матэматыка, родная мова, геаграфія і інш.)». (Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 5 верасьня 1931 г.).

Важнейшымі прычынамі гэтага зьяўляюцца недахопы праграм (у асаблівасьці для 2-га канцэнтру школы — 5, 6, 7 групы), нездавальняючасьць мэтадаў школьнай работы і слабасьць мэтадычнага кіраўніцтва з боку народных камісарыятаў асьветы і іх мясцовых органаў, слабая дысцыпліна ў школе, а іншы раз адсутнасьць усякай дысцыпліны і парадку.

Трэба таксама адзначыць адсутнасьць увязкі паміж рознымі зьвеньнямі школьнай сыстэмы, у рэзультаце чаго пачатковая і сярэдняя школы ні па выпускаемых кантынгентах, ні па ўзроўні ведаў не адпавядаюць задачам падрыхтоўкі кадраў для паступленьня ў тэхнікумы, ВТНУ і ВНУ.

ЦК УсеКП(б) пастанаўляе:

I. Аб навучальных праграмах

Канстатуючы, што пасьля пастановы Цэнтральнага Камітэту ад 5 верасьня 1931 году навучальныя праграмы Наркамасьветы РСФСР для пачатковай і сярэдняй школы, у асаблівасьці праграмы 1-ай ступені, значна палепшыліся, сталі вышэйшымі па аб'ёме ведаў і больш сыстэматычнымі па разьмяшчэньні вучэбнага матар'ялу ў параўнаньні з праграмамі мінулых год, ЦК лічыць, што яны ўсё яшчэ маюць істотныя недахопы і паміны быць — у частцы праграм 5,6,7 г. г. — пераапрацаваны.

Асноўнымі недахопамі праграм зьяўляюцца:

а) **Перагрузка праграм вучэбным матар'ялам**, якая прыводзіць да таго, што рад дысцыплін праходзіцца ў школе насьпех, а веды і навыкі дзецьмі цьвёрда ня ўсвойваюцца і не замацоўваюцца (па матэматыцы — адзел стэрэаметрыі ў 7-й групе, па літаратуры — уключэньне ў вучэбныя праграмы твораў, недаступных вучням і г. д.).

б) **Невыстарчальнасьць і нават адсутнасьць увязкі** паміж паасобнымі праграмамі, у асаблівасьці паміж праграмай па матэматыцы і чарчэньні, а таксама паміж праграмамі па матэматыцы, фізыцы, хэміі і праграмай па працы і г. д. (геамэтрычныя веды, якія патрабуюцца праграмай па чарчэньні 5-га году, даюцца толькі ў 6-м годзе, вывучэньне фізыкі ў 5, 6, і 7 гадох не забясьпечана аб'ёмам матэматычных ведаў і г. д.).

в) **Няўнасьць прынцыповых памылак** у радзе праграм і ўпранчэнска-вульгарызатарскі падыход пакаторых складальнікаў праграм да сваёй задачы (адсутнасьць разуменьня аб паскарэньні, разуменьня аб сіле і законах Н'ютона ў курсе фізыкі, змазваньне разуменьня аб клетцы ў курсе біалёгіі, адсутнасьць арыентыровкі на карту ў курсе геаграфіі, паасобныя палітычныя памылкі ў курсе грамадазнаўства).

г) **Невыстарчальнасьць гістарычнага падыходу да праграм** па грамадзкіх прадметах, якая выяўляецца ў тым, што ў іх надзвычай слаба даецца ўяўленьне аб гістарычным мінулым народаў і краін, аб разьвіцьці чалавечага грамадзтва і г. д.

Істотным недахопам зьяўляецца і тое, што не распрацаваны яшчэ праграмы па гісторыі.

У адпаведнасьці з гэтым ЦК прапануе:

1. Наркамасьветы РСФСР пераапрацаваць да 1-га студзеня 1933 году праграмы для пачатковай і сярэдняй школы такім чынам, каб забясьпечыць сапраўднае, добрае і сыстэматычнае ўсваеньне дзецьмі асноў навук, веданьне фактаў і навыкі правільнай гутаркі, пісаньня, матэматычных практыкаваньняў і інш.

2. Пры пераапрацоўцы праграм кіравацца наступным:

а) Правесьці ўнутранае пераразьмеркаваньне вучэбнага матар'ялу праграм па матэматыцы, фізыцы, хэміі і біалёгіі для груп 2-га канцэнтру, прывёўшы аб'ём і характар вучэбнага матар'ялу гэтых праграм у поўную адпаведнасьць з узроснымі асаблівасьцямі дзяцей кожнай з гэтых груп. Адначасова з гэтым неабходна зрабіць і частковае скарачэньне праграм 2-га канцэнтру па матэматыцы, фізыцы, біалёгіі і хэміі з тым, каб бязумоўна забясьпечыць цьвёрдае і добрае ўсваеньне і замацаваньне асноў кожнай навукі.

б) Зьнішчыць існуючыя факты невыстарчальнай увязкі паміж вучэбнымі праграмамі 2-га канцэнтру па матэматыцы, фізыцы і хэміі, а таксама і паміж праграмамі па гісторыі, грамадазнаўству, літаратуры і мовах.

в) Улічыць неабходнасьць выкарыстаньня ў вучэбных заняткох (практыкаваньні па расійскай мове, матэматыцы, грамадазнаўстве і г. д., лябараторныя работы па фізыцы, хэміі і прыродазнаўстве) матар'ялу сацыялістычнага будаўніцтва, забясьпечыўшы дакладны падбор наступнага дзецям матар'ялу.

г) Значна ўзмацніць элемэнты гістарызму ў праграмах па грамадазнаўстве, па мове і літаратуры, геаграфіі, ілюструючы асноўныя разьдзелы і тэмы гэтых дысцыплін неабходным фактычным матар'ялам, гістарычнымі экскурсамі і параўнаньнямі.

д) Прадугледзець павялічэньне колькасьці гадзін на матэматыку, пабудаваўшы курс матэматыкі ў пачатковай і сярэдняй школе такім чынам, каб забясьпечыць пераход да наступных ступеняй прафтэхнічнай асьветы.

е) У праграмах па фізыцы — увесьці адсутныя элемэнты статыкі, разуменьне аб сіле, аб законах Н'ютона; па біалёгіі — разуменьне аб клетцы і клетачнай будове арганізму; па хэміі — неабходна больш сыстэматычнае складаньне праграмы, разьлічанае на цьвёрдае ўсваеньне элемэнтарных хэмічных паняцьняў; па геаграфіі — праграма павінна забясьпечыць веданьне карты, у асаблівасьці карты СССР, асноўных паняцьняў фізычнай геаграфіі, асноўных элемэнтаў фізычнай, прыродная і эканамічнай геаграфіі СССР як у цэлым, так і кожнай з рэспублік, краёў і абласьцей у паасобку; у вучэбныя праграмы па геаграфіі павінны быць уключаны ў належным аб'ёме і веды па геаграфіі капіталістычных краін.

ж) Прызнаць неабходным, каб сярэдняя школа абавязкова забясьпечыла веданьне аднэй чужаземнай мовы кожнаму, які канчае школу.

з) Адзначаючы, ня гледзячы на некаторае паляпшэньне, усё яшчэ **нездавальняючы стан праграм** і выкладаньня роднай мовы і грамадазнаўства, ЦК УсеКП(б) прапануе Наркамасьветы РСФСР зьвярнуць асаблівую ўвагу на распрацоўку праграм па гэтых прадметах і паляпшэньне выкладаньня іх.

Праграма па роднай мове павінна забясьпечыць усваеньне сапраўды сыстэматычнага і дакладна акрэсьленага кола ведаў, а таксама добрых навыкаў правільнага чытаньня, пісаньня і вуснага говару, увёўшы ў практыку навучальнай работы вучняў самастойныя пісьмовыя работы, граматычны разгляд і інш. як у клясе, так і на даму.

і) Прызнаць неабходным у вучэбныя праграмы па грамадазнаўстве, літаратуры, мовах, геаграфіі і гісторыі ўвесьці важнейшыя веды, якія датычаць нацыянальных культур народаў СССР, іх літаратуры, мастацтва, гістарычнага разьвіцьця, а таксама і элемэнты краязнаўства СССР (прыродныя асаблівасьці, прамысловасьць, сельская гаспадарка, сацыяльна-эканамічнае разьвіцьцё і г. д.).

к) Надаючы вялікае значэньне пастаноўцы працоўнага навучаньня ў палітэхнічнай школе, прызнаць неабходным пераапрацаваць вучэбныя праграмы па працы з тым, каб забясьпечыць сапраўднае злучэньне навучаньня з прадукцыйнай працай і вывучэньне «ў тэорыі і на практыцы галоўных галін вытворчасьці» (праграма УсеКП(б), кіруючыся ўказаньнямі Леніна, што палітэхнічны прынцып «не патрабуе навучаньня ўсяму, але патрабуе навучаньня асновам сучаснай індустрыі наогул» (запіс Леніна на III сэсіі УсеЦВК 7-га скліканьня 26-27 верасьня 1920 году па дакладу Наркамасьветы).

Выходзячы з гэтага, неабходна забясьпечыць, як указваў Ленін, наступныя «асновы палітэхнічнай асьветы»: «асноўныя паняцьці аб электрычнасьці», «прыстасаваньне электрычнасьці да мэханічнай прамысловасьці», «таксама да хэмічнай», «таксама аб пляне электрыфікацыі РСФСР», наведваньне «ня менш 1—3 раз электрычнай станцыі, заводу, саўгасу», «ведаць такія-та асновы аграномыі і г. д. (распрацаваць дэтальна мінімум ведаў)».

У сувязі і побач з гэтым вучням у сярэдняй школе павінна быць забясьпечана аўладаньне асноўнымі інструмантамі і атрыманьне навыкаў па апрацоўцы дрэва, мэталу і інш.

II. Аб арганізацыі вучэбнай работы і ўмацаваньні школьнага рэжыму

Адзначыць, што ў адносінах арганізацыі вучэбных заняткаў у школе, пасьля пастановы ЦК ад 5 верасьня 1931 году, устаноўлен больш парадак (цьвёрдыя расклады, больш выразная арганізацыя вучэбнай работы і ходу вучэбных заняткаў).

Аднак, ня гледзячы на ўказаньне ЦК у гэтай пастанове аб тым, што ні адзін мэтад ня можа быць прызнан асноўным і універсальным мэтадам вучобы, у практыцы работы школ атрымаў пашырэньне, як асноўны, так званы «лябараторна-брыгадны мэтад» (у радзе школ ён стаў універсальным), які суправаджаўся арганізацыяй пастаянных і абавязковых брыгад, прывёўшых да скажэньняў у выглядзе абязьлічкі ў вучэбнай рабоце, да зьніжэньня ролі пэдагога і іграваньня ва многіх выпадках індывідуальнай вучобы кожнага вучня.

ЦК УсеКП(б) прапануе народным камісарыятам асьветы саюзных рэспублік ліквідаваць гэтыя скажэньні лябараторна-брыгаднага мэтаду, а вучэбны працэс у школе арганізаваць на наступнай падставе:

а) Асноўнай формай арганізацыі вучэбнай работы ў пачатковай і сярэдняй школе павінен зьяўляцца ўрок з дапай групай вучняў са строга вызначаным раскладам заняткаў і цьвёрдым складам вучняў. Гэта форма павінна ўключыць у сябе, пад кіраўніцтвам настаўніка, агульна-групавую, брыгадную і індывідуальную работу кожнага вучня з ужываньнем рознастайных мэтадаў навучаньня. Пры гэтым павінны усяляк разьвівацца калектыўныя формы вучэбнай работы, не практыкуючы арганізацыі пастаянных і абавязковых брыгад.

б) Настаўнік абавязан сыстэматычна, пасьлядоўна выкладаць сваю дысцыпліну, усямерна прывучаючы дзяцей да работы над падручнікам і кнігай, да рознага роду самастойных пісьмовых работ, да работы ў габінэце, у лябараторыі, вучэбнай майстэрні і шырока ўжываючы, побач з гэтымі асноўнымі мэтадамі, рознага роду дэманстрацыі вопытаў і прыбораў, экскурсіі (на завод, у музэй, у поле, у лес і інш.); пры гэтым настаўнік павінен усямерна дапамагаць дзецям пры затрудненьнях у іх вучэбных заняткох. Трэба сыстэматычна прывучаць дзяцей да самастойнай работы, шырока практыкуючы розныя заданьні, у меру аўладаньня пэўным курсам ведаў (рашэньне задач і практыкавальняў, выраб мадэляў, работа ў лябараторыях, зьбіраньне гербарыеў, выкарыстаньне прышкольных вучасткаў для вучэбных мэт і інш.).

ЦК абавязвае Наркамасьветы і іх органы бязумоўна забясьпечыць ва ўсёй вучэбнай рабоце школы кіруючую ролю настаўніцкага пэрсаналу.

в) У аснову ўліку школьнай работы павінен быць пакладзен бягучы індывідуальны сыстэматычна правядзімы ўлік ведаў вучняў. Настаўнік павінен у працэсе вучэбнай работы ўважліва вывучаць кожнага вучня. На аснове гэтага вывучэньня настаўнік абавязан у канцы кожнай чвэрці складаць характарыстыку пасьпяховасьці кожнага вучня па даным прадмеце. Усякія складаныя схэмы і формы ўліку і справаздачнасьці — забараніць.

Лічыць неабходным устанаўленьне ў канцы году праверачных іспытаў для ўсіх вучняў.

г) Прапанаваць Наркамасьветы тэрміновы распрацаваць мэтодыкі па асобных дысцыплінах, а таксама па розных відах вучэбна-выхаваўчай работы (напрыклад, у лябараторыі, на вытворчасьці, на прышкольным вучастку) дастасоўна да ўзросных асаблівасьцяй вучняў.

д) У радзе выпадкаў адміністрацыя школы і пэдагогі не зварачаюць увагі на парушэньні парадку ў школе і не праяўляюць ініцыятывы да ўмацаваньня сьвядомай дысцыпліны вучняў. З прычыны гэтага абавязаць загадчыкаў школ і пэдагогаў павесьці настойлівую выхаваўчую работу, змагаючыся з учынкамі вучняў, якія парушаюць парадак у школе, прыцягваючы да гэтай справы грамадзкія арганізацыі, бацькоў, камсамольскія і піянэрскія арганізацыі, а непапраўных з вучняў, хуліганствуючых, якія зьневажаюць настаўніцкі пэрсанал і парушаюць распараджэньні адміністрацыі школы і пэдагогаў і якія ломяць школьны рэжым, несуюць або крадуць маемасьць школы, — выключаць са школы бяз права паступленьня ў школу тэрмінам ад аднаго да трох год.

е) Прапанаваць народным камісарыятам асьветы распрацаваць рад мерапрыемстваў па сыстэматычнай пэдагагічнай прапагандзе, прыступіўшы неадкладна да складаньня і выданьня папулярнай пэдагагічнай літаратуры для бацькоў.

ж) У мэтах узьняцьця эфэктыўнасьці пэдагагічнай работы ў школе і ўлічваючы вялізарнае значэньне для гэтага забясьпячэньня школы такімі неабходнымі прыналежнасьцямі настаўніцкай працы, як вучэбныя падручнікі, вучэбная апаратура для габінэтаў і вучэбна-вытворчае абсталяваньне майстэрань і іншыя віды вучэбных падручнікаў, — распрацаваць у двухмесячны тэрмін плян разгортваньня выпуску і забясьпячэньня пачатковай і сярэдняй школы вучэбнымі. дапамогамі (картамі, глёбусамі, наглядзімі табліцамі і г. д.), вучэбнай апаратурай для прырода-навуковых і фізыка-матэматычных габінэтаў, а таксама і плян стандартнага абсталяваньня рабочых пакояў і школьных майстэрань адпаведнымі варштатамі, інструмантамі і матар'яламі ў мэтах падвядзеньня належнай вучэбнай базы для арганізацыі палітэхнічнай школы.

Плян пашырэньня выпуску і паляпшэньня забясьпячэньня школ гэтымі падручнікамі павінен быць распрацован з такім разьлікам, каб ужо ў 1932-33 навучальным годзе даюцца значнага павышэньня матар'яльнай вучэбнай базы ўсёй школьнай работы.

III. Аб настаўніцкіх кадрах

1. Адзначаючы значны рост актыўнасьці настаўніка і павышэньне яго адказнасьці за работу на працягу апошніх год, ЦК УсеКП(б) падкрэсьлівае ўсё ўзрастаючую ролю настаўніка ў справе навучаньня дзяцей асновам навук, выхаваньня ў іх сьвядомай дысцыпліны і камуністычных адносін да вучобы і працы.

ЦК УсеКП(б) абавязвае народныя камісарыяты асьветы саюзных рэспублік, савецкія і партыйныя органы ўсямерна забясьпечыць настаўніку ў яго рабоце неабходныя ўмовы для пасьпяховага выкананьня ім адказных і гнаровых абавязкаў па навучаньні і выхаваньні маладога пакаленьня Саюзу Сацыялістычных Савецкіх Рэспублік. Сыстэматычная работа над павышэньнем ідэйна-палітычнага ўзроўню, агульнай асьветы і пэдагагічнага майстэрства настаўніка, безагаворачнае і дакладнае выкананьне дырэктыў ЦК і СНК СССР аб прыраўнаньні настаўніка па снабжэньні прадуктамі і прамтаварамі да прамысловага рабочага, своячасовая выплата заработнай платы, клопаты аб кватэры, сям'і і адпачынку настаўніка, чулыя адносіны да яго штодзённых патрэб, — усё гэта павінна характарызаваць сапраўднае выкананьне савецкімі і партыйнымі органамі дырэктыў партыі аб ленінскіх адносінах да **настаўніка**.

2. Наркамасьветы ўстанавіць дакладны парадак пераводу і назначэньня настаўнікаў і такую расстаноўку кадраў на мясцох, якая забясьпечвала-б правільнае выкарыстаньне на рабоце вопытных настаўнікаў і сыстэматычную дапамогу з боку апошніх маладым настаўніцкім кадрам.

Прапанаваць мясцовым органам не адрываць настаўніка для грамадзкай работы ў часе заняткаў у школе і падрыхтоўкі да іх (падрыхтоўка да лекцый, самаадукацыі, удзел на курсах і ў мэтадычных нарадах і г. д.), катэгарычна забараніўшы выкарыстаньне настаўніка для выкананьня розных тэхнічных даручэньняў па рабоце сельсавету, райвыканкому і г. д.

3. Лічыць неабходным рабіць прыёмы дзяцей настаўніцтва ў тэхнікумы, ВНУ і ВТНУ нароўні з рабочымі.

4. ОГИЗ'у да 1 студзеня 1933 году арганізаваць падбор і рассылку настаўнікам па даступнай цане камплектаў кніг, найбольш неабходных пэдагогам па асобных галінах ведаў і пэдагагічных пытаньнях.

Наркамасьветы сумесна з кнігагандлюючымі арганізацыямі апублікаваць у месячны тэрмін ільготныя ўмовы куплі і атрыманьня кніг настаўнікамі.

5. Наркамасьветы прыняць меры да таго, каб у найкарацейшы тэрмін паставіць належным чынам усю справу пэдагагічнай асьветы, завочнага і кароткатэрміновага навучаньня настаўнікаў, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на аўладаньне настаўніцтвам мэтодыкай і інструмантамі пэдагагічнай працы (умелае скарыстаньне для навучаньня падручнікаў, прыбораў, карты, наглядных табліц, кіно, радыё і г. д.).

Усямерна папырыць практыку заахвочаньня і прэміяваньня настаўнікаў за лепшыя ўзоры работы, а таксама ўлік і выкарыстаньне ў кіраўніцтве дасягненьняў перадавых школ і настаўнікаў.

IV. Аб старэйшых групах сярэдняй школы

У мэтах ажыцьцяўленьня праграмы партыі — «аб правядзеньні бясплатнай і абавязковай агульнай і палітэхнічнай (якая зна ёміць у тэорыі і на практыцы з усімі галоўнымі галінамі вытворчасьці) асьветы для ўсіх дзяцей абодвух родаў да 17 год» (праграма УсеКП(б), а таксама ў мэтах хутчэйшага ўзьняцьця ўзроўню агульна-асьветнай і палітэхнічнай падрыхтоўкі вучняў сярэдняй школы, папырэньня падрыхтаваных кантынгентаў для вышэйшай школы і зьнішчэньня ўзроснай неадпаведнасьці паміж сярэдняй і вышэйшай школай, прыступіць, пачынаючы з 1932-33 навучальнага году, да рэарганізацыі сямігадовай палітэхнічнай школы ў дзесяцігадовую.

Выходзячы з гэтага, прапанаваць СНК СССР у месячны тэрмін зацьвердзіць канкрэтны плян і разьмеры арганізацыі ў падыходзячым навучальным годзе над сямігодкай 8-х груп, як першы крок да дзесяцігадовай школы.

ЦК УсеКП(б).

Перад скліканьнем германскага рэйхстагу

БЭРЛІН, 28. Праз два дні павінен сабрацца новы рэйхстаг. Унутрыпалітычнае напружаньне ў Германіі ўсё павялічваецца па меры набліжэньня адкрыцьця рэйхстагу. Заўтра вечарам ці пасьлязаўтра раніцой адбудзецца нарада Гіндэнбурга з фон-Папэнам, фон-Гайлем і Майснэрам, на якой павінны быць вырашаны асноўныя палітычныя пытаньні ў сувязі са скліканьнем рэйхстагу.

Пераговоры нацыянал-сацыялістаў з партыяй цэнтру працягваюцца. Чакаюць, што ў іх прыме ўдзел таксама Гітлер, які прыяжджае сёньня ў Бэрлін. Як паведамляе Гугенбергаўскае агенцтва «Тэлеграфэн-Уніён» з асьведомленых колаў цэнтру і гітлераўцам удалася дасягнуць згоды па асноўных пытаньнях аб стварэньні кааліцыйнага ўраду. Дасягнута ніби нават згода па пэрсанальных пытаньнях, зьвязаных з фармаваньнем новага ўраду. Імёны кандыдатаў, асабліва кандыдата на пост канцлера, адносна якога дасягнута згода, трымаюцца ў стражайшым сакрэце. «Тэлеграфэн-Уніён» піша, што цяпер зноў гавораць як аб сур'ёзнай магчымасьці аб камбінацыі Шлейхэр-Брюнінг-Штрасэр.

«Тэлеграфэн-Уніён» паведамляе, што ў выпадку ажыцьцяўленьня гэтага пляну разьлічваюць, што фон-Папэн сам падасьць у адстаўку.

ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК!

Першы месяц збожжазагатовак па БССР амаль скончыўся. Ад тэмпаў разгортваньня кампаніі ў жніўні ва многім залежыць далейшы ход загатовак; вынікі работы ў гэтым месяцы прадвырашаюць далейшае разгортваньне кампаніі.

У гэтым годзе мы маем пэўныя посьпехі ў здачы збожжа ў параўнаньні з мінулым. Калі на 25 жніўня 1931 году было загатоўлена 3,7 проц. гадавога плану, дык зараз — 5,9 проц.

Рост сацыялістычнага сэктару вёскі, ажыцьцяўленьне пастановы партыі і ўраду аб збожжазагатоўках і калгасным гандлі, аб ахове грамадзкай маемасьці — ствараюць магутныя стымулы для поўнага і датэрміновага выкананьня плянаў. Пры ўмове пяўхіль нага ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі і растлумачэньня іх шырокім масам сялянства, посьпех загатовак забясьпечан.

Аднак, здача збожжа на БССР адстае ад плянавых заданьняў. Жнівеньскі плян за 25 дзён выкананы толькі на 40 проц. Ёсьць раёны, напрыклад, **Лоеўскі, Лельчыцкі, Парыцкі, Горацкі, Шклоўскі**, якія здалі менш 20 проц.

Адставаньне ў збожжазагатоўках можна тлумачыць толькі выключна слабай масавай работай вакол загатовак, дрэннай арганізацыяй абмалоту, недаваньнямі, фармальна-механістычным падыходам да плянаваньня і апартуністычнай бязьдзейнасьцю роду арганізацый. Далёка ня ўсюды зразумелі, што правільнае, хуткае і выразнае плянаваньне, ліквідацыя ўраўнілаўскага падыходу да паасобных вёсак і калгасаў, дакладны ўлік асаблівасьцяй кожнага населенага пункту, штодзённае глыбокае растлумачэньне сялянам усёй «арытмэтыкі» плянаваньня, растлумачэньне неабходнасьці здачы збожжа ў першую чаргу — вырашаюць посьпех загатовак.

У радзе месц (Крычаў, Горкі) пляны даведзены да низоўкі са значным спазьненьнем, растлумачальная работа вакол загатовак не разгорнута.

Калгасы БССР ідуць у авангардзе здатчыкаў: яны выканалі 14 проц. гадавога пляну. Аднак, заданьне на жнівень па калгасным сэктары поўнасьцю ня выкананa. Да 25 жніўня калгасамі здана каля 75 проц. пляну.

У той час, як калгасы Чырвонаслабодзкага, Рагачоўскага, Дзяржынскага і Віцебскага раёнаў перавыканалі жнівеньскія пляны, на калгасах Бягомльскага, Ельскага, Пятрыкоўскага, Шклоўскага раёнаў работа па збожжазагатоўках амаль не пачалася. Пастановы партыі аб калгасным гандлі і ахове калгаснай маемасьці папулярызуюцца вельмі слаба. У радзе раёнаў маюць месца скажэньні прынцыпаў авансаваньня калгаснікаў, мае месца асяданьне збожжа ў калгасных сьвірнах, вывяз яго на прыватны рынак. Усё гэта — вынік правазмартуністычнай практыкі паасобных арганізацый і райкалгасаюзаў, зусім невыстарчальнай барацьбы з дробна-буржуазнымі тэндэнцыямі адсталых калгаснікаў, з кулацкім уплывам.

Ня ўсюды пераможан яшчэ абязьлічаны на дыход да калгасаў пры дачы заданьняў. Толькі пры ўмове зьнішчэньня ўраўнілаўкі ў гэтай справе можна забясьпечыць выкананьне дырэктывы партыі аб тым, каб «калгасы, якія лёпш пасеялі, убралі і акуратна выканалі ўстаноўленны для іх плян дзяржаўных загатовак, мелі адзаеда ў звайм распараджэньні для ўласных патрэб большую колькасьць хлеба».

Неабходна таксама пакончыць са злачынным зацягваньнем уборкі і абмалоту ўраджаю, бо **правільная арганізацыя ўборкі і абмалоту — неабходная ўмова выкананьня пляну загатовак.**

Вялікая задача — разгарнуць барацьбу супроць спэкуляцыі збожжам новага ўраджаю, памятуючы, што гандаль збожжам дазваляецца толькі пасьля выкананьня збожжа загатоўчага пляну і стварэньня пасеўных фондаў, г. зн. з 15 студзеня 1933 году.

Справа гонару ўсіх раённых арганізацый, усіх калгасаюзаў — дабіцца поўнай ліквідацыі адставаньня калгаснага сэктару, **поўнасьцю выканаць гадавое заданьне да 15-ай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.**

Па прыкладзе перадавых калгасаў («**Камунар Магілеўшчыны**» — Клімавіцкага раёну, «**Чырвоны сьцяг**» і «**Пераможца**» — Дзяржынскага раёну) калгасы БССР павінны дабіцца перамогі на збожжазагатоўчым фронце.

Надзвычай дрэннае становішча са здачай збожжа аднаасобнымі гаспадаркамі. Лічба — 0,5 проц. выкананьня жнівеньскага пляну — сьведчыць аб злачынай бязьдзейнасьці раду раёнаў у гэтай справе. Даволі адзначыць, што у пакаторых раёнах, напрыклад, Горацкім, Шклоўскім, Чавускім і інш., да загатовак па аднаасобным сэктары фактычна яшчэ не прыступалі. Тут мы маем справу з махровай апартуністычнай практыкай, з «лявацкай» недаацэнкай аднаасобнага сэктару. Поўнай адсутнасьцю масава-растлумачальнай работы сярод аднаасобнікаў карыстаецца кулак, які вядзе агітацыю за зрыў загатовак, які імкнецца па-свойму вытлумачыць пастановы партыі аб калгасным гандлі збожжам.

Трэба поўнасьцю ўлічыць і ліквідаваць памылкі мінулага году, калі рад раённых арганізацый, замест разгортваньня бальшавіцкай барацьбы за выкананьне плянаў, прадаставілі загатоўкі самацёку і заняліся імі з вялікім спазьненьнем.

Ва многіх мясцох амаль ня прыступлена да спагнаньня цьвёрдых заданьняў. На ўсёй БССР у парадку цьвёрдых заданьняў здачы толькі 54 тоны. З раду месц наведамляюць аб фактах прытупленьня клясавай пільнасьці ў адносінах кулака, мяккацелаасьці да кулацка-спэкуляцыйных элемэнтаў, што прывяло да сабатажу і зрыву плянаў. У выніку — спэкуляцыя збожжам новага ўраджаю на рынках, ажыўленьне дзейнасьці спэкулянтаў і перакупшчыкаў.

Зламаць кулацкі сабатаж, праводзіць рашучую палітыку спагнаньня цьвёрдых заданьняў, ударыць па апартуністах, якія выкрэсьліваюць кулака са збожжазагатоўчых плянаў, рашуча перасечы спробы давесьці цьвёрдыя заданьні да серэднацкіх гаспадарак — задача кожнай нізавой партыйнай і савецкай арганізацыі.

Неабходна на справе ажыцьцяўляць пастановы ЦК і СНК і саюзнага ўраду аб барацьбе з клясава-варожымі кулацкімі, спэкуляцыйнымі элемэнтамі, якія імкнуцца разбурваць грамадзкую маемасьць і сарваць загатоўкі.

Вопыт перадавых раёнаў — **Камарынскага, Дзяржынскага, Клімавіцкага** і інш., — якія значна перавыканалі заданьне за жнівень, наглядна паказвае поўную рэальнасьць плянаў збожжазагатовак. Уся справа ва ўменьні па-бальшавіцку весьці кампанію, злучыць разгортваньне шырокай масавай работы сярод працоўнага сялянства з рашучым націскам на кулака, уменьні спалучыць уборку і асеньнюю сяўбу з загатоўкамі.

Непрымірыма змагаючыся з клясава-варожымі элемэнтамі і іх агентурай, няўхільна ажыцьцяўляючы дырэктывы партыі аб загатоўках і калгасным гандлі, — дабіемся поўнай перамогі на фронце збожжазагатовак.

Яшчэ ня ўбрана 395 тысяч га збожжавых

Сёньня канчаецца апошні тэрмін уборкі яравых збожжавых культур. Між тым па 25-е жніўня па БССР убрана ўсяго толькі **343.112** га, або 68 проц. Трэба яшчэ зрабіць 395.981 га. Дырэктыва партыі аб своячасовым скончэньні ўборкі ня выкананa. Гэта паказвае на тое, што ня ўсе партарганізацыі ўсьвядомілі ўсю гаспадарча-палітычную важнасьць асноўнага лёзунгу «Паставіць у галаву вутла барацьбу са стратамі».

Яшчэ горш. З 843.000 жатых культур зьвезена і засьмяртавана ўсяго толькі 69,3 проц. Кожны прапушчаны дзень наносіць вялізарны ўдар па ўраджайнасьці сацыялістычных палёў.

Асабліва ганебна адстаюць 18 раёнаў БССР, якія па 25-е жніўня ўбралі ня больш 50 проц. яравога збожжа. З іх горш за ўсё па паўночнай зоне: **Асьвейскі** — 21,4 проц., **Чашніцкі** — 33,9 проц., **Сіроцінскі** — 34,3 проц., **Дрысенскі** — 37,2 проц., **Сураскі** — 38,3 проц.; па цэнтральнай зоне: **Бягомльскі** — 39,8 проц., **Старадарожскі** — 40.5 проц.; па паўдневай зоне: **Ельскі** — 47,5 проц., **Лельчыцкі** — 48,6 проц., **Камарынскі** — 50,9 проц.

Посьпехі 5 раёнаў (**Крычаўскага** — убрана па 100 проц., **Слуцкага** — 94,7 проц., **Рагачоўскага** — 94,5 проц., **Чырвона-Слабодзкага** — 91,5 проц., **Брагінскага** — 91 проц.) паказваюць, што пры ўмелай расстаноўцы сіл, пры правільна наладжаным штодзённым аперацыйным кіраўніцтве можна своячасова ўбраць увесь ураджай, уникнуць ад страт 1.000 цэнт. збожжа.

Партарганізацыі адстаючых раёнаў павінны неадкладна ўжыць усе захады да таго, каб у бліжэйшую пяцідзеўку не пакінуць на полі ніводнага снапа, лявзжатага і пазьвезенага збожжа.

Лепшым стымулам для пасьпяховага скончэньня ўборкі зьяўляецца правільная і своячасовая выдача як натуральных, так і грашовых авансаў калгаснікам выключна па колькасьці выпрацаваных працадзён. Толькі пры ўмовах поўнага ажыцьцяўленьня лёзунгу партыі — хто больш і лепш працуе, той і больш атрымлівае — адстаючыя раёны могуць навучаць пралучнае, узьняць тэмпы ўборкі, скончыць уборачную кампанію ў бліжэйшыя-ж дні.



Скірдаваньне збожжа ў калгасе «Сацыялістышэр вэг» (Парыцкі раён).

Ліквідаваць разрыў паміж уборкай і звозкай

ВОРША. (Наш кар.). На 25 жніўня па Аршанскім раёне яравыя ўбраны на 82 проц. Поўнасьцю зжата пшаніца і ячмень, якія сярод збожжавых культур займаюць 32 проц.

Вельмі марудна ўбіраецца авёс. Усяго аўса ўбрана толькі 50 проц. Яшчэ горшае становішча са звозкай зжатага ўраджаю. Калі зжата 82 проц., дык зьвезена 75 проц. дзежатага.

Разрыў паміж звозкай і ўборкай павінен быць неадкладна ліквідаваны.

Пра самаабкладаньне сельскага насельніцтва

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

Для выкананьня пляну культурнага і гаспадарчага будаўніцтва калектывізуючайся вёскі ў заключным годзе пяцігодкі, а таксама ўлічваючы сыстэматычны рост матар'яльнага ўзроўню і культурных патрабаваньняў жывёлы, плошчаў грамадзкага карыстаньня (выгонаў, лугоў), а таксама на ўтрыманьне палавых вартаўнікоў;

г) на супрацьпажарныя мерапрыемствы: будаваньне, капітальны і бягучы рамонт і гаспадарчае ўтрыманьне пажарных дэпо і хлявоў, на набыцьцё і ўтрыманьне супроць пажарных машын і пажарных прылад і на ўтрыманьне пажарных вартаўнікоў;

д) на ўпарадкаваньне і гаспадарчае ўтрыманьне ўстаноў, якія маюць мэтай падняцьце сельскай гаспадаркі (агранамічных, ветэрынарных, збожжлачышчальных, пракатных і злучных пунктаў, хлебазапасных магазынаў і г. д.), а таксама правядзеньне мэліярацыйных работ мясцовага значэньня.

3. Катэгарычна забараняецца скарыстоўваць сродкі ад самаабкладаньня на пакрыцьцё якіх-небудзь выдаткаў, не прадугледжаных агульнымі сходамі насельніцтва у пастановах аб самаабкладаньні.

4. У самаабкладаньні ўдзельнічаюць:

а) калгаснікі, якія маюць неграмаджаныя даходы, а таксама і тыя з іх, якія ня маюць гэтых даходаў,

б) аднаасобныя сялянскія гаспадаркі;

в) рабочыя, служачыя, саматужнікі і рамесьнікі і інш. грамадзяне, якія пастаянна жывуць у даным населішчы, хаця-б яны і ге займаліся сельскай гаспадаркай.

5. Ад самаабкладаньня вызваляюцца наступныя катэгорыі грамадзян, якія не займаюцца сельскай гаспадаркай і жывуць у мясцовасьцях, пералічаных у арт. 1 гэтай пастановы:

а) рабочыя, служачыя, каапэраваныя саматужнікі і рамесьнікі, калі іх заработак не перавышае 40 руб. у месяц;

б) вайскоўцы кадравага радавога і начальніцкага складу, апрача доўгатэрміновага адпускных; вайскоўцы начальніцкага страявога складу рабоча-сялянскай міліцыі і ваенізаванай аховы (ў тым ліку ваенізаванай пажарнай аховы); ня ўдзельнічаюць у самаабкладаньні тыя чырвонаармейцы, якія пасьля ліпеня месяца ўступілі ў калгасы і ня маюць сваёй гаспадаркі;

в) асобы, нагароджаныя адным з ордэнаў Саюзу ССР і БССР, або ганаровай рэвалюцыйнай зброяй і героі працы;

г) інваліды вайны;

д) пэнсіянэры, якія атрымліваюць пэнсію ад дзяржаўных органаў, або грамадзкіх арганізацый, калі яны ня маюць іншых даходаў;

е) інвалыды працы, аднесеныя да першай, другой і трэцяй груп інвалідасьці;

ж) вучні, якія атрымліваюць стыпэндыі.

6. Самаабкладаньне можа быць праведзена толькі па пастанове агульнага сходу грамадзян данага населішча, якія маюць права выбіраць у саветы.

Для ўстанаўленьня самаабкладаньня на сходзе павінна прысутнічаць ня менш паловы агульнага ліку грамадзян данага населішча, якія маюць права выбіраць у саветы. Калі на сход не зьявіцца гэта колькасьць грамадзян, дык склікаецца другі сход, які лічыцца правамоцным, калі на ім прысутнічае адна трэць паказаных грамадзян.

Самаабкладаньне ўстанаўляецца большасьцю галасоў грамадзян, прысутных на сходзе. Прынятыя на сходзе пастановы абавязковы для ўсіх грамадзян.

7. Пытаньне аб устанаўленьні самаабкладаньня ў населішчы можа быць унесена на абмеркаваньне агульнага сходу грамадзян як па пачыну сельскага савету, так і па пачыну грамадзкіх арганізацый, калгаснікаў, ініцыятыўных груп працоўных аднаасобнікаў і паасобных грамадзян.

8. Устанавіць наступныя разьмеры самаабкладаньня для асобных катэгорый насельніцтва:

а) калгаснікі, якія абкладзены ў 1932 г. сельска-гаспадарчым падаткам пратрэсыўна, плацяць самаабкладаньне ў разьмеры ад 10 да 14 рублёў па гаспадарку. Калгаснікі, вызваленыя ад сельска-гаспадарчага падатку ў 1932 г., а таксама абкладзеныя сельска-гаспадарчым падаткам у цьвёрдых стаўках, плацяць самаабкладаньне ад 5 да 8 руб. на гаспадарку. Калгаснікі, якія ня маюць неатрамаджаных даходаў, плацяць самаабкладаньне ў разьмеры 5 руб. на гаспадарку.

Сельскія саветы маюць права часткова ці поўнасьцю вызваліць ад самаабкладаньня асобныя гаспадаркі калгаснікаў, неабкладзеныя сельска-гаспадарчым падаткам у 1932 г.

Гаспадаркі аднаасобнікаў, якія ўвайшлі ў калгас пасьля ўліку аб'ектаў абкладаньня па сельска-гаспадарчым падатку, але да афармленьня самаабкладаньня ў даным населішчы, плацяць самаабкладаньне як калгаснікі;

б) аднаасобныя працоўныя сялянскія гаспадаркі, якія абкладзены сельска-гаспадарчым падаткам у 1932 г. у цьвёрдых стаўках, плацяць самаабкладаньне ў разьмеры ад 12 да 18 руб. на гаспадарку. Аднаасобныя працоўныя сялянскія гаспадаркі, якія абкладзены сельска-гаспадарчым падаткам прагрэсыўна, плацяць самаабкладаньне ў разьмеры ад 100 проц. да 150 проц. акладу сельска-гаспадарчага падатку 1932 г., запісанага ў акладным лісьце пасьля вылічэньня скідак, ільгот, даных да правядзеньня самаабкладаньня, але ня менш разьмеру самаабкладаньня, устаноўленага для аднаасобных гаспадарак таго-ж населішча, якія абкладзены сельска-гаспадарчым падаткам у цьвёрдых стаўках. Аднаасобныя сялянскія гаспадаркі, якія вызвалены ад сельска-гаспадарчага падатку ў 1932 г., плацяць самаабкладаньне ад 8 да 12 руб. на гаспадарку.

Сельскія саветы маюць права ў асобных выпадках вызваліць ад самаабкладаньня часткова або поўнасьцю асобныя гаспадаркі аднаасобнікаў, якія вызвалены ад сельска-гаспадарчага падатку ў 1932 г.

в) кулацкія гаспадаркі плацяць самаабкладаньне ў разьмеры 200 проц. ад сумы сельска-гаспадарчага падатку 1932 г.;

г) рабочыя і служачыя, саматужнікі і рамесьнікі, якія не займаюцца сельскай гаспадаркай і жывуць у мясцовасьцях, дзе праводзіцца самаабкладаньне, плацяць самаабкладаньне ў цьвёрдых стаўках у залежнасьці ад разьмеру іх заработку паводле наступнай табліцы:

Разьмер месячнага заработку ў рублёх	Разьмер самаабкладаньня ў рублёх: Для рабочых, служачых і каапэраваных саматужнікаў і рамесьнікаў	Для некаапэраваных саматужнікаў і рамесьнікаў
Звыш 40 да 75 руб.	4	10
« 75 да 125 руб.	7	20
« 125 да 175 руб	15	30
« 175 да 225 руб.	25	60
« 225 да 275 руб.	40	80
« 275 руб.	60	120

Сельскія саветы могуць вызваляць ад самаабкладаньня асобных рабочых, служачых і каапэраваных саматужнікаў.

д) грамадзяне з непрацоўнымі даходамі, якія не займаюцца сельскай гаспадаркай і абкладаюцца падаходным падаткам, а таксама і вызваленыя ад яго, плацяць самаабкладаньне ў разьмеры 100 проц. ад сумы сельска-гаспадарчага падатку, якая была-б налічана на іх, калі-б іх даход абкладаўся ў тых-жа частках і па тых-жа стаўках, якія ўстаноўлены для абкладаньня сельска-гаспадарчым падаткам у індывідуальным парадку;

е) грамадзяне з неўстаноўленымі крыніцамі даходу, якія не займаюцца сельскай гаспадаркай, калі апошняю ўстаноўленаю крыніцай існаваньня іх зьяўлялася атрыманьне непрацоўных даходаў, плацяць ад 20 да 100 руб. самаабкладаньня.

9. У пастанове агульнага сходу пра самаабкладаньне павінна быць паказана:

а) мэта і мерапрыемствы, на якія праводзіцца самаабкладаньне;

б) процант самаабкладаньня ад сумы сельска-гаспадарчага падатку;

в) стаўкі самаабкладаньня для калгаснікаў і аднаасобнікаў, вызваленых ад сельскагаспадарчага падатку, або якія плацяць яго ў цьвёрдых стаўках;

г) стаўкі самаабкладаньня для грамадзян з неўстаноўленымі крыніцамі даходу;

д) тэрміны выплаты самаабкладаньня.

10. Агульны нагляд за правядзеньнем самаабкладаньня і за будаўніцтвам на сродкі самаабкладаньня ўскладаецца на раённыя выканаўчыя камітэты і гарадзкія саветы, вылучаныя ў самастойныя адміністрацыйна-гаспадарчыя адзінкі, якія павінны складаць раённыя пляны правядзеньня самаабкладаньня.

Прапанаваць Народным камісарыятам Асьветы, Аховы Здароўя, Зямляробства, Камунальнай Гаспадаркі і Галоўдортрансу рабіць патрэбную тэхнічную дапамогу будаўніцтву, якое праводзіцца за сродкі самаабкладаньня, а таксама ўжываць неабходныя захады да забесьпячэньня гэтага будаўніцтва патрэбнымі будаўнічымі матар'яламі.

11. Агульны нагляд за скарыстаньнем сродкаў па самаабкладаньні па іх мэтавае прызначэньне ўскладаецца на Народны Камісарыят Фінансаў, раённыя выканаўчыя камітэты і гарадзкія саветы.

12. Работа сельскіх саветаў па самаабкладаньні правяраецца рэвізійнымі камісіямі не радзей аднаго разу ў квартал.

Аб выніках праверкі рэвізійныя камісіі павінны даводзіць да ведама сельскага савету, а таксама агульных сходаў грамадзян пры справаздачных дакладах па іх сельскіх саветах.

13. Абавязаць гарадзкія саветы і раённыя выканаўчыя камітэты разгарнуць шырокую агітацыйна-масавую работу на папулярызацыі і правядзеньні самаабкладаньня, уцягнуўшы ў гэтую работу шырокія колы рабочых, калгаснікаў, бедняты і працоўных аднаасобнікаў, даючы жорсткі адпор кулацка-эпманскім спробам зрываць самаабкладаньне.

14. З выданьнем гэтай пастановы скасаваць пастанову ЦВК і СНК БССР за 15 жніўня 1931 г. («Пра самаабкладаньне насельніцтва» (З. З. БССР 1931 г. № 37, паст. 234).

Вык. аб. старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР — М. ГНІЛЯКЕВІЧ.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР — М. ГАЛАДЗЕД.

За сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР — ЛЯУКОЎ.

29 жніўня 1932 г.

гор. Менск.

АБ САМААБКЛАДАНЬНІ СЕЛЬСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА

З пастановы Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў Саюзу ССР

У мэтах выкананьня пляну культурнага і гаспадарчага будаўніцтва калектывізуючайся вёскі ў заключным годзе пяцігодкі, а таксама ўлічваючы сыстэматычны рост матар'яльнага ўзроўню і культурных патрэбнасьцей калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў, Цэнтральны выканаўчы камітэт і Савет народных камісараў Саюзу ССР пастанаўляюць:

Грамадзяне, якія пражываюць у сельскіх мясцовасьцях і ў дачных пасёлках, могуць выносіць пастановы аб самаабкладаньні для задавальненьня культурных і гаспадарчых патрэб, маючых грамадзкае значэньне.

Самаабкладаньне дапускаецца выключна для задавальненьня культурных і гаспадарчых патрэбнасьцей данага населішча або агульных патрэбнасьцей некалькіх населішчаў.

Катэгарычна забараняецца выкарыстаць сродкі ад самаабкладаньня на пакрыцьцё якіх-небудзь расходаў, не прадугледжаных агульнымі сходамі насельніцтва у пастановах аб самаабкладаньні.

Самаабкладаньне можа быць праведзена толькі па пастанове агульнага сходу грамадзян данага населішча, маючых права выбіраць у саветы.

Для ўстанаўленьня самаабкладаньня на сходзе павінны прысутнічаць ня менш паловы агульнага ліку грамадзян данага населішча, маючых права выбіраць у саветы. Калі на сход не зьявіцца гэта колькасьць грамадзян, то склікаецца паўторны сход, які лічыцца правамоцным пры наўнасьці адной трэці паказаных грамадзян.

Самаабкладаньне ўстанаўляецца большасьцю галасоў грамадзян, якія прысутнічаюць на сходзе. Прынятыя на сходзе пастановы абавязковы для ўсіх грамадзян.

Самаабкладаньне праводзіцца паводле пастановы агульнага сходу грамадзян як у грашовай, так і ў натуральнай форме.

Ад самаабкладаньня вызваляюцца наступныя катэгорыі грамадзян, якія пражываюць у сельскіх мясцовасьцях і дачных пасёлках, але не вядуць сельскай гаспадаркі:

а) рабочыя, служачыя, каапэраваныя саматужнікі і рамесьнікі, калі іх заработак не перавышае 40 руб. у месяц;

б) вайсковаслужачыя кадравага радавога і начальніцкага складу, апрача доўгатэрміновага адпускных, вайсковаслужачыя начальніцкага складу, якія знаходзяцца ў рэзэрве, вобы страявога складу рабоча-сялянскай міліцыі і ваенізаванай аховы (ў тым ліку ваенізаванай пажарнай аховы);

в) асобы, узнагароджаныя адным з ордэнаў Саюзу ССР або ганаровай рэвалюцыйнай зброяй і героі працы;

г) інваліды вайны;

д) пэнсіянэры, якія атрымліваюць пэнсіі ад дзяржаўных органаў або грамадзкіх арганізацый, калі яны ня маюць іншых даходаў;

е) інваліды працы, аднесеныя да першай, другой і трэцяй груп інваліднасьці;

ж) вучні, якія атрымліваюць стыпэндыі.

Гаспадаркі калгаснікаў, якія маюць неапрамаджаныя даходы, прымаюць удзел у самаабкладаньні ў наступных разьмерах:

а) калгаснікі, якія абкладаюцца ў 1932 годзе сельгаспадаткам прагрэсыўна, прыцягваюцца да самаабкладаньня ў разьмерах ад 10 да 14 руб. з гаспадаркі;

б) калгаснікі, як вызваленыя ад сельгаспадатку ў 1932 годзе, так і тыя, што абкладаюцца сельгаспадаткам па цьвёрдых стаўках, прыцягваюцца да самаабкладаньня ў разьмерах ад 5 да 8 руб. з гаспадаркі;

в) калгаснікі, ня маючыя неграмаджаных даходаў, прыцягваюцца да самаабкладаньня ў разьмерах 5 руб. з гаспадаркі.

Сельсаветам прадастаўляецца права частково або поўнасьцю вызваляць ад самаабкладаньня паасобныя гаспадаркі калгаснікаў, якія вызвалены ад сельгаспадатку ў 1932 годзе.

Гаспадаркі аднаасобнікаў, уступіўшыя ў калгасы пасьля ўліку аб'ектаў абкладаньня па сельгаспадатку, але да афармленьня самаабкладаньня ў даным населішчы, плацяць яго ў разьмерах, устаноўленым для калгаснікаў.

Працоўныя аднаасобнікі прымаюць удзел у самаабкладаньні ў наступных разьмерах:

а) аднаасобнікі, якія абкладаюцца сельгаспадаткам у 1932 годзе ў цьвёрдых стаўках, прыцягваюцца да самаабкладаньня ў разьмерах ад 12 руб. да 18 руб. з гаспадаркі;

б) аднаасобныя гаспадаркі, якія абкладаюцца сельгаспадаткам у 1932 годзе прагрэсыўна, прыцягваюцца да самаабкладаньня ў разьмерах ад 100 проц. да 150 проц. акладу сельгас падатку за 1932 год, але ня ніжэй стаўкі, устаноўленай па даным населішчы для аднаасобнікаў, якія прыцягваюцца дэ абкладаньня сельгаспадаткам у цьвёрдых стаўках;

в) аднаасобныя гаспадаркі, вызваленыя ад абкладаньня сельгаспадаткам у 1932 годзе, прыцягваюцца да самаабкладаньня ў разьмерах ад 8 руб. да 12 руб. з гаспадаркі.

Сельсаветам прадастаўляецца права частково або поўнасьцю вызваляць ад самаабкладаньня паасобныя гаспадаркі аднаасобнікаў, якія вызвалены ад сельгаспадатку ў 1932 годзе.

Купацкія гаспадаркі прыцягваюцца да самаабкладаньня ў разьмерах 200 проц. акладу сельгаспадатку за 1932 год.

Рабочыя і служачыя, саматужнікі і рамесьнікі, якія пражываюць у сельскіх мясцовасьцях і не вядуць сельскай гаспадаркі, прымаюць удзел у самаабкладаньні па цьвёрдых стаўках, у залежнасьці ад разьмеру заработку, які яны атрымліваюць, згодна наступнай табліцы:

Разьмер месячнага заработку ў рублёх	Разьмер самаабкладаньня ў рублёх: Для рабочых, служачых і каапэраваных саматужнікаў і рамесьнікаў	Для некаапэраваных саматужнікаў і рамесьнікаў
Звыш 40 да 75 руб.	4 р.	10 р.
» 75 » 125 руб.	7 р.	20 »
» 125 » 175 руб.	15 р.	30 »
» 175 » 225 руб.	25 р.	60 »
» 225 » 275 руб	40 р.	80 »
» 275 руб.	60 р.	120 »

Сельсаветы могуць вызваляць ад самаабкладаньня паасобных рабочых, служачых і каапэраваных саматужнікаў.

Грамадзяне з непрацоўнымі даходамі, не вядучыя сельскай гаспадаркі і абкладаемыя падаходным падаткам, а таксама вызваленыя ад яго, прыцягваюцца да самаабкладаньня ў разьмерах 100 проц. сумы, якая прылічэлася-б з іх, калі-б яны абкладаліся па сваім даходзе сельгаспадаткам.

Сельскі савет зьбірае сумы самаабкладаньня ў тэрміны, устаноўленыя агульнымі сходамі.

Нядоімка па самаабкладаньні спаганяецца сельскім саветам у парадку, вызначаным для спагнаньня сельгаспадатку.

(«ПРАВДА»).

Аб ходзе падрыхтоўкі да прызыву 10 году нараджэньня

Усім райкомам КП(б)Б, райкомам ЛКСМБ, райпрафсаветам, райваенкаматам, паліторганам вайсковых часьцей і рэдакцыям раённых газэт

Агітмасавы аддзел ЦК КП(б)Б, ПУАКР ВВА, ЦК ЛКСМБ, ЦСПСБ і газэта «Зьвязда» адзначаюць зусім нездавальняючы ход падрыхтоўчай работы да прызыву ў РСЧА 1910 году нараджэньня.

Лёзунг, даны ЦК КП(б)Б «Дамо Чырвонай арміі клясава-баяздольнае, пісьменнае, фізычна-моцнае і вайскова падрыхтаванае папаўненьне» — павінен быць выкананы.

Між тым, весткі аб ходзе гэтай кампаніі паказваюць, што выяўленьне і адсеў клясава-варожых элементаў сярод прызыўнікоў праводзіцца сутуба фармальна, бяз уцягваньня шырокіх мас рабочых, калгаснікаў і сялян-аднаасобнікаў, у сувязі з чым у радзе раёнаў процант адсеяных вельмі нізкі, а ў некаторых ён дасягае ад 7 да 11. Ліквідацыя пянісьменнасьці ні ў адным раёне ня скончана, ліквідацыя малапісьменнасьці ідзе рабскімі тэмпамі. Партыйна-камсамольскі рост на нізкім узроўні. Аздараўленчая работа праводзіцца слаба. Зусім слаба падрыхтаваны да прызыву і тыя прадпрыемствы, на якіх будуць арганізаваны прызыўныя пункты. Кароткі час, які застаўся да прызыву, неабходна выкарыстаць для праверкі практычнага выкананьня ўказаньняў ЦК КП(б)Б і Палітуправы ВВА і для выпраўленьня ўсіх наяўных недахопаў, з тым, каб **прызыў заваршальнага году пяцігодкі быў узорным.**

Неабходна правесьці:

1. Зьлёты прызыўнікоў па прадпрыемствах, новабудоўлях, калгасах і саўгасах.

2. У гарадох — палітычныя масоўкі прызыўнікоў з шырокім прыцягненьнем працоўных мас. У раёнах — правесьці агульна-сельсавецкія, або куставыя канфэрэнцыі прызыўнікоў.

3. Канфэрэнцыі жонак і матак прызыўнікоў.

Асабліва шырокую і масавую работу сярод усіх рабочых трэба правесьці на буйнейшых прадпрыемствах, дзе арганізуюцца прызыўныя пункты.

4. Правесьці 15-дзеньнік заваршэньня лік відацыі пянісьменнасьці і малапісьменнасьці сярод прызыўнікоў. Заняткі ў гэтых групах праводзіць штодзенна з такім разьлікам, каб лёзунг «Чырвоная армія павінна атрымаць пісьменнае папаўненьне» быў выкананы. За выкананьне гэтай задачы поўнасьцю адказваюць органы НКА, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі.

5. Курсы, арганізаваныя па лініі Асоавіяхіму, Аўтадору, Беларускага Кіраўніцтва Сувязі, павінны забясьпечыць поўнае праходжаньне праграмы і стопроцантны выпуск (арганізаваць штодзенныя заняткі, праверыць наведваньне заняткаў).

6. Там, дзе адведзенымі гурткамі ахоплен незначны лік прызыўнікоў, асоавіяхімарганізацыям стварыць 5-дзенныя курсы па вайсковай падрыхтоўцы прызыўнікоў.

7. Шырока арганізаваць даведачную работу аб ільготах чырвонаармейцам і іх сем'ям. Правесьці вечары пытаньняў і адказаў і спэцыяльныя вечары дапрызыўнікаў у рабочых клюбах. У клюбах, бібліятэках, нардамах і хатах-чытальнях арганізаваць **куткі дапрызыўнікаў.** У раённых цэнтрах, пад адказнасьць райвыканкомаў, і ў сельсаветах, пад адказнасьць старшынь сельсаветаў і сакратароў парт'ячэек арганізаваць цэнтральныя куткі дапрызыўнікаў і стылы даведак.

8. У бліжэйшыя дні партыйным і камсамольскім арганізацыям канчаткова падабраць партыйцаў і камсамольцаў для работы на прызыўных пунктах, вылучыць палітсуправаджаючых прызыўнікоў да прызыўных пунктаў у часьці. Падрыхтаваць арганізацыю ўрачыстых сустрэч прызыўнікоў у месцах праходжаньня.

9. Праверыць падрыхтаванасьць каапэрацыйных арганізацый да абслугоўваньня прызыўнікоў на пунктах і па шляху сьледваньня.

10. На бліжэйшым партыйным і камсамольскім дні паставіць пытаньне аб ходзе падрыхтоўкі да прызыву.

11. Раённым газэтам правесьці пераклічку прадпрыемстваў, калгасаў, саўгасаў, сельсаветаў, па пытаньнях падрыхтоўкі да прызыву.

Цалкам уключыцца ў камсамольскі рэйд, які праводзіцца газэтамі «Комсомольская правда» і «Красная звезда».

Асноўнымі пытаньнямі праверкі павінны быць:

а) сацыяльна-клясавы адбор прызыўнікоў;

б) ліквідацыя пянісьменнасьці і малапісьменнасьці;

в) вайскова-палітычная падрыхтоўка прызыўнікоў і рост партыі і камсамолу;

г) аздараўленчая работа сярод прызыўнікоў (медагляд);

д) матар'яльнае забесьпячэньне прызыўнікоў (па лініі каапэрацыі, чыгуначнага і водзнага транспарту).

У перыяд праверкі партыйныя і камсамольскія арганізацыі павінны яшчэ больш згуртаваць працоўную моладзь вакол ленінскай партыі, яе ЦК і правадыра партыі тав. Сталіна на барацьбу за генэральную лінію партыі і выкананьне чарговых задач сацыялістычнага будаўніцтва (ударныя брыгады імя прызыву чацьвертага, заваршальнага году пяцігодкі на заводах і ў калгасах, чырвоныя абозы са збожжам, падпіска на пазыку, уборка збожжавых, ільнаўборка і інш.).

Райвыканкомам, гарсаветам, Белдзяржкіно і прафарганізацыям забясьпечыць масавацка-культурнае абслугоўваньне дапрызыўнікоў у часе прызыву праз кіно, тэатры, клюбныя кіно-ўстаноўкі і раённыя кіно-перасоўкі.

Практыкаваць заключэньне сацдагавораў паміж прызыўнікамі і прадпрыемствамі, калгасамі, саўгасамі на выкананьне прызыўнікамі баявых абавязацельстваў, а прадпрыемствамі, калгасамі, саўгасамі — прамфінпляну і чарговых задач сацыялістычнага будаўніцтва. Такія дагавары могуць быць як групавыя, так і індывідуальныя. Таксама практыкаваць узаемныя наказы, шырока агаглашаючы іх на вечарох масавых провадаў дапрызыўнікаў.

Праверка павінна ўсю падрыхтоўчую работу па прызыве паставіць так, каб сам прызыў па БССР прайшоў узорна.

Дамо арміі палітычна-моцнае, фізычна-здаровае і цалкам пісьменнае папаўненьне!

ПУАКР ВВА.

Агітмасавы аддзел ЦК КП(б)Б.

ЦК ЛКСМБ.

ЦСПСБ.

Рэдакцыя газэты «Зьвязда».

ГРАМАДЗКАЯ ЎЛАСНАСЬЦЬ СЬВЯШЧЭННА І НЕДАТЫКАЛЬНА

ПАСОЛКІНЫХ І ТАТАРЖЫЦКІХ—НА ЛАВУ ПАДСУДНЫХ!

Сыгналы калгасьнікаў павінны быць пачуты

З вялікай зацікаўленасьцю калгаснікі Гомельшчыны прапрацоўваюць закон аб ахове грамадзкай уласнасьці ў брыгадах, на сходах і ў гурткох. Рад калгасаў узялі на сябе самаабавязацельствы па ахове калгаснай маемасьці.

Але за прапрацоўкай не заўсёды сьледуюць практычныя справы па выкрыцьці злачынцаў. Віна тут перш за ўсё падае на райкалгассаюз і сельпарт'ячэйкі, якія абмежаваліся пасылкай дырэктыў са штампам «прапрацаваць», а дапамога і канкрэтнае кіраўніцтва для глыбокай прапрацоўкі гэтага пытаньня зусім адсутнічаюць.

Між тым у раёне ёсьць цэлы рад выпадкаў хуліганства і пакраж калгаснай маемасьці.

Старшыня калгасу «Чырвоная зьмена», Карнялінскага сельсавету, Стось Іван украў калгасную карову і прадаў яе. Сьледуючы яго прыкладу яшчэ тры калгаснікі ўкралі па аднэй карове кожны. Стось Іван прыгаворан на 3 гады, а іншыя тры калгаснікі на 3 месяцы прымусовай работы кожны. Нарсуд правяў літасьць да раскрадальнікаў калгаснай маемасьці.

У калгасе «Чырвоны герой», Дзятлавіцкага сельсавету, аднаасобнік Гаршуноў Сяргей сыстэматычна раскрадвае калгасную маемасьць і ўраджай—ячмень, гарох, сена і інш. Гаршунова не прыцягнулі да судовай адказнасьці і ён працягвае красьці калгаснае дабро.

Калгасьнік Самуйлікаў Пракоп з пасёлку Вялынь, Дзятлавіцкага сельсавету, сыстэматычна косіць калгасную сенажаць калгасу «Чырвоны герой» і прадае сена на рынку. За кароткі час Самуйлікаў прадаў калгаснага сена каля 80 пуд. акрамя гэтага 40 пуд. калгаснага сена знайшлі ў яго гумне. Калі калгаснікі запыталі ў яго, што ён робіць, ён нахабна адказаў: «Я ня ўночы крау, а сярод белага дня».

Новы закон аб ахове грамадзкай уласнасьці дае магчымасьць жорстка ўдарыць па руках тых, хто пасягае на сацыялістычную ўласнасьць. Але да Самуйлікава і іншых злачынцаў ня прыняты належныя меры, ня гледзячы на неаднаразовыя патрабаваньні калгаснікаў аддаць яго пад суд.

Клясавы ворат ня толькі крадзе і падбух торвае красьці калгасную маемасьць. Ён дзейнічае тут і падпалам. Уночы з 22 на 23 жніўня ў калгасе «1-га мая», Заброўскага сельсавету, спален стог сена каля 300 пуд.

Нарэшце, апошні факт злачыннага разбазарваньня калгаснай маемасьці, які сьведчыць аб сьлепаце мясцовай ячэйкі і раённых арганізацый.

У калгасе «Бядняк», Нярэшынскага сельсавету, часова выконваў абавязкі старшыні калгасу Пясолкін. За кароткі час свайго «кіраўніцтва» ён сьвядома развальваў калгас. Вось прыклады яго шкоднай дзейнасьці. З-за яго нядбайнасьці быў страўлен пасеў аўса на плошчы ў 0,4 га, гароху—1,5 га. Пясолкін засеяў для сваіх уласных патрэб 0,4 га зямлі, якія прызначаліся для засеву гароднінны для сталоўкі.

Пясолкін увесь час прысвойвае калгасныя грошы. Ён сыстэматычна п'янствуе на грошы, атрыманыя ад пераправы праз раку на калгасным пароме. Ніякага кантролю за працай парому і рыбнай арцелі ня было. Гэта і давала магчымасьць Пясолкіну разбазарваць калгасныя сродкі.

Гэтым яшчэ не канчаецца «паслужны сьпіс» гэтага старшыні калгасу. Ня так даўно ён уночы ўварваўся да загадчыка малочнай фэрмай Козырава Цярэха, адабраў у яго сілай ключы ад малочнай фэрмы і пачаў вырываць з рук дакументы з мэтай замесьці сьляды пакрадзеных малочных прадуктаў.

Усе гэтыя дзеяньні падкулачніка і п'яніцы праходзілі на вачох сельпарт'ячэйкі і раённых кіруючых арганізацый. Дзеяньні Пясолкіна—гэта дзеяньні клясавага ворага, па якім павінна моцна ўдарыць рука пралетарскага закону. Сход калгаснікаў, абгаварыўшы злачынствы Пясолкіна, патрабаваў неадкладна прыцягнуць яго да судовай адказнасьці. Гэта патрабаваньне калгаснікаў павінна быць тэрмінова выканана.

Н. Гасман.

Жорстка пакараць шайку злачынцаў

3-га верасьня на пасажырскай станцыі Менску транспартнай сэкцыяй Вярхоўнага суда будзе разглядацца справа шайкі зладзеяў, якія абвінавачваюцца ў сыстэматычным раскрадваньні чыгуначных грузаў.

Перад судом прадстануць сем зладзеяў: кіраўнік зладзейскай шайкі Татаржыцкі, прытонатрымальнік Грыгаз, зладзеі Пашкоўскі, Крук, Зайкоўскі, Грынка, Сідорская і спэкулянтка Валуй (злодзей Бабух уцёк да пачатку сьледзтва). Усе яны — якія прыцягваліся да адказнасьці за розныя злачынствы па некалькі раз.

За апошнія часы па ст. Менск шляхам узлому вагонаў імі зроблен рад пакраж. У ліпені імі ўкрадзена 6 жаночых польтаў, 5 жніўня — 6 пар абутку і 9 жніўня — 28 польтаў.

Усе пакрадзеныя рэчы дастаўляліся на кватэру Грыгаз, дзе Сідорская праз спэкулянтку Валуй арганізоўвала продаж іх і атрыманыя грошы дзяліліся паміж грабежнікамі.

Гэтымі пакражамі шайка зладзеяў не задавольвалася. Яны ставілі сваёй мэтай у бліжэйшыя дні пакрасьці груз з вайсковым абмундыраваньнем, галоўным чынам, абуткам. Аднак, гэта не ўдалося,— яны былі злоўлены.

Пралетарскі суд, дастасаваўшы пастанову ЦВК і СНК аб раскрадваньні грузаў на транспорце, павінен жорстка пакараць злачынцаў.

С—ц.

У адказ на пастанову ЦВК і СНК—узмоцнім выкананьне сваіх абавязкаў перад пралетарскай дзяржавай

БАРЫСАЎ. (Па тэлефону).

27 жніўня адбылася раённая канфэрэнцыя калгаснікаў, беднякоў і серадняко—аднаасобнікаў з удзелам 134 дэлегатаў. Работа канфэрэнцыі насіла канкрэтны, дзелавы характар. Абмеркаваны пытаньні ходу ўборачнай, задачы асеньняй пасеўнай, выкананьня плянаў збожжазагатовак і аб рэвалюцыйнай законнасьці. Абмеркаваньне апошняга пытаньня было цесна зьвязана з рэалізацыяй пастановы партыі і ўраду аб ахове сацыялістычнай маемасьці.

У прынятых рашэньнях дэлегаты абавязаліся забясьпечыць датэрміновае правядзеньне асеньняй сяўбы пад лёзунгам барацьбы за павышэньне ўраджайнасьці і поўнае выкананьне плянаў збожжазагатовак не пазьней 1 кастрычніка. На выкананьне гэтых задач канфэрэнцыя выклікае на сацэнаборніцтва калгаснікаў, беднякоў і серадняко—аднаасобнікаў Аршанскага раёну.

Канфэрэнцыя горача вітае пастанову ЦВК і СНК аб рэвалюцыйнай законнасьці і ахове сацыялістычнай маемасьці. Дэлегаты аба вязваюцца ўзмацніць клясавую пільнасьць на ўсіх вучастках па ахове сацыялістычнай маемасьці, пад лёзунгам «сацыялістычная маемасьць сьвяшчэнна і недатыкальна».

Канфэрэнцыю вітала рабочая дэлегацыя Бярэзінскага камбінату і дэлегацыя старэйшага ў раёне калгасу, арганізаванага ў 1922 г.—«Чырвоная зорка», Кішчына-Слабодзкага сельсавету.

З гонарам аб рэзультатах ударнае працы, бадзёрым голасам, лепшая ўдарніца «Чырвонай зоркі»—Арына Захан рапартуе: калгас поўнасьцю скончыў уборку сена і ўсіх збожжавых культур. Засеяна ўжо 20 гэктараў жыта. Поўнасьцю выканан плян збожжазагатовак.

Пад бурныя воплескі канчаецца яе заява: «У гонар канфэрэнцыі калгас здае звыш пляну тону збожжа».

Івашын.

Займаюцца агульнымі разважаньнямі

Па калгасах Рагачоўскага раёну пастановы ЦВК і СНК СССР аб ахове грамадзкай уласнасьці не распрацаваны. Барацьба з раскрадваньнем калгаснай маемасьці вядзецца невыстарчальна.

У калгасе імя Калініна раскрадзен ураджай жыта з 3-х га. Такое-ж становішча было ў часе ўборкі і ў аднэй з дапаможных гаспадарак гэтага калгасу. Праўленьне, ведаючы аб гэтых фактах, ня прымае ніякіх мер да зьнішчэньня іх.

У калгасе «1-га мая», Стаўпянскага сельсавету, злоўлены Жыранкоў і Рагавенскі, якія капалі ўночы бульбу для продажу на рынку. Да адказнасьці яны ня прыцягнуты. У калгасе «3-ці- рашаючы» наглядаюцца выпадкі начнога дзеньня калгасных кароў, аднак, старшыня калгасу Буханцоў не рэагуе на гэтыя выпадкі злачынага разбазарваньня калгаснай маемасьці.

(Белта).

УЛАСНУЮ ХАРЧОВУЮ БАЗУ—КОЖНАЙ СТАЛОЎЦЫ!

У Віцебску грамадзкае харчаваньне—забыты вучастак

Віцебск — адзін з буйнейшых пралетарскіх цэнтраў БССР. Колькасьць пастаянных рабочых, занятых на прадпрыемствах Віцебску дасягае 40.000 чал.

Належная пастаноўка грамадзкага харчаваньня ў Віцебску павінна адыграць важнейшую ролю ў справе ўзьняцьця прадукцыйнасьці працы і выкананьня прамфінпляну.

Між тым гэты важнейшы вучастак на стаў у цэнтры ўвагі віцебскіх арганізацый.

Грамадзкае харчаваньне пастаўлена дрэнна. Для прыкладу возьмем сталоўку **панчошнай фабрыкі імя КІМ**, якая штодзенна выпускае 3.000 абедаў. Якасьць абедаў у гэтай сталоўцы зусім нізкая. Гатуюцца абеды ў пераважнасьці толькі з тых прадуктаў, якія атрымліваюць у цэнтралізаваным парадку. Закупкі праводзяцца выпадкова, па прыватным рынку, па высокай цане. Самазагатоўкі не разгорнуты.

Ад «самазагатовак» на прыватным рынку значна падаражэлі абеды. Калі раней мясны абед каштаваў 60 кап., дык зараз ён каштуе 1 р. 10 - 1 р. 20 к. Гэта без накладных выдаткаў, бо дырэкцыя фабрыкі за свой кошт забясьпечвае сталоўку транспартам, апалам і г. д.

Сьвінаадкормачны і трусагодоўчы пункты забыты адміністрацыяй сталоўкі. 142 сьвіньні ня маюць за сабой належнага догляду: несвачасова атрымліваюць корм.

У сталоўцы рэдка бывае гародніна. Гуркоў амаль ня відаць. Гэта ў той час, калі прыгарадная гаспадаркa фабрыкі «Тулава» штодзенна прадае гуркі, гуркамі запоўнены ўсе крамы і рынкі гораду.

На відзельнічыну работнікі сталоўкі не пераведзены. Рабочыя абслугоўваюцца дрэнна, каб дачакацца абеду, рабочы вымушан патраціць увесь свой абедзенны перапынак.

А вось малюнак другой віцебскай сталоўкі. Адзін з буйнейшых сталовак Віцебску № 17 з пропускной здольнасьцю ў 4.000 абедаў. Са сваёй задачай яна не спраўляецца. Якасьць абедаў вельмі нізкая, мэню ніколі не зьмяняецца. Вялікія чаргі — звычайная справа. Прадукты захоўваюцца вельмі дрэнна. У кладоўцы побач з хлебам яна ходзіцца вадкае мыла і паогул усе прадукты ляжаць адкрытымі.

Ня лепш працуе рабочая сталоўка № 14, якая абслугоўвае букаўнікоў. Тут таксама існуюць вялікія чаргі, якія амаль кожны дзень зрываюць працдысцыпліну, бо для атрыманьня абедзенных талёнаў рабочаму не хапае перапынку. Абедаючыя ня раз патрабавалі, каб для рабочых кожнага аб'екту пабудовы быў вызначан пэўны час для абедаў, але ніхто не рэагуе на іх патрабаваньні.

Аналёгічнае становішча і на **фабрыцы «Прафінтэрн»**. 1.800 швэйнікаў незадаволены работай сталоўкі. Цэх грамадзкага харчаваньня не арганізаваў работы, як належыць, ня ўведзена зьдзельшчына сярод работнікаў кухні, ніхто не адказвае за сваю работу, за якасьць абедаў. Нядаўна з-за пядбайнасьці кухараў **Кухарэнца і Гарнастаева** больш 400 порцый студэнтыны было сапсавана.

Кошт абедаў павысіўся на 60 проц.

Усё гэта вынік таго, што парт. і прафарганізацыі ня цікавяцца работай сваёй сталоўкі, не вядуць барацьбы за паляпшэньне харчаваньня, за разгортваньне самазагатовак.

Дрэнна пастаўлена работа грамадзкага харчаваньня на большасьці прадпрыемстваў Віцебску. Але там, **дзе фабрычныя арганізацыі па-баявому ўзяліся за справу паляпшэньня рабочага снабжэньня, мы маем добрыя вынікі.** Прыкладам можа служыць рабочая сталоўка фабрыкі «Дзьвіна», якая сапраўды ператварылася ва ўзорны цэх грамадзкага харчаваньня. Чаргі зьнічтожаны. Якасьць абедаў значна палепшана, штодзенна мяняецца мэню. Ёсьць пэўныя посьпехі ў патаненьні кошту страў. Мясны абед каштуе 50 кап., а посны — 30 кап. **Пры сталоўцы адкрыта рабочае кафэ. Кухня забясьпечана ўсімі відамі прадуктаў і гароднінай,** бо адміністрацыя сталоўкі не спадзяецца на цэнтралізаванае снабжэньне, а разгортвае самазагатоўкі непасрэдна ў калгасах.

Нельга не адзначыць агідна марудных тэмпаў будаўніцтва новых сталовак пры буйнейшым заводзе «Чырвоны мэталіст» і фабрыцы «Сьцяг індустрыялізацыі», якія будуюцца ўжо два гады. Калі яны будуць скончаны — невядома, хаця матэрыялы будаўніцтва забясьпечана.

Віцебскі трэст грамадзкага харчаваньня ня зьвязан са сталоўкамі, не праводзіць штодзеннага апэрацыйнага кіраўніцтва, амаль нічога ня робіць у справе разгортваньня самазагатовак. Трэст ня хоча разумець, што дэцэнтралізаваныя загатоўкі і па-зімовыя закупкі ў саўгасаў, калгасаў і калгаснікаў даюць новыя рэсурсы харчовых прадуктаў, якія павінны быць мабілізаваны на паляпшэньне грамадзкага харчаваньня.

Галоўнейшая задача, што стаіць перад усёй сыстэмай грамадзкага харчаваньня, **ёсьць разгортваньне самазагатовак, арганізацыя ўласнай харчовай базы — дапаможных гаспадарак (сьвінаадкорм, трусатнікі, адкорм птушкі і гароды)** і інш., бо гэтыя мерапрыемствы павінны адыграць рашаючую ролю ў паляпшэньні якасьці і рознастайнасьці абедаў, у зьніжэньні кошту страў, якія выпускаюцца, у павялічэньні ахопу рабочых харчаваньнем.

Да справы паляпшэньня харчаваньня рабочых трэба прыцягнуць усю грамадзкасьць заводаў і фабрык, трэба ўзмацніць рабочы кантроль над работай сталовак.

А. Зарубежны, Р. Вярхоўскі.

Лепшая сталоўка Гомелю

Па прадпрыемствах Гомелю рэалізацыя жнівеньскай пастановы ЦК аб грамадзкім харчаваньні дае канкрэтныя вынікі. Арганізацыя цэхаў грамадзкага харчаваньня—сталовак стала справай усіх рабочых і фабрычна-заводзкіх арганізацый. У выніку значна палепшылася работа сталовак, узьнялася якасьць абедаў.

Прыкладам добрай работы можа служыць сталоўка **«Палесдруку»**, якая абслугоўвае 800 рабочых усіх трох зьмен. Яна працуе з 6 гадзін раніцы да 11 гадзін ночы. Ёсьць выбар страў з 3-4 страў. Мэню мяняецца кожны дзень. Ліквідавана чарга, абед працягваецца ня больш 10 мінут. За санітарным становішчам сталоўкі, кухні і якасьцю абедаў сочыць спэцыяльны санітарны доктар мэдпункту. У абедзенай залі заўсёды чыста і прыемна. На сталох кветкі.

Апрача агульных страў сталоўка гатуе дыетычныя абеды для хворых.

Асноўнай крыніцай забясьпячэньня сталоўкі прадуктамі зьяўляюцца самазагатоўкі. Умелая пастаноўка самазагатовак дапамагла даць рабочаму танны і добраякасны абед. З 1 па 20 жніўня **загатоўлена розных прадуктаў на 24 тыс. руб.**, у лік якіх уваходзяць: капусты 2.272 кгр., гуркоў—5.300 кгр., бульбы—18 тон, мяса— адна тона, рыбы—400 кгр. Пры сталоўцы ёсьць свой сьвінарнік, трусатнік і малочная фэрма.

Па пастаноўцы работы і якасьці абедаў сталоўка «Палесдруку» зьяўляецца адной з лепшых у горадзе. Неабходна вопыт сталоўкі «Палесдруку» выкарыстаць на іншых прадпрыемствах.

Н. Г.

Горацкае спажыўтаварыства зрывае забесьпячэньне студэнтаў

ГОРКІ. Крамы і сталоўка горацкага спажыўтаварыства, якія абслугоўваюць студэнтаў, працуюць вельмі дрэнна.

Каб атрымаць хлеб, студэнтам прыходзіцца штодзенна стаяць у чарзе па 3—4 гадзіны.

Гарспажыўтаварыства ня ведае, колькі ёсьць студэнтаў, якіх трэба забясьпечваць хлебам, ня гледзячы на тое, што сам паявы стол выдае хлебныя карткі. Бываюць і такія здарэньні, што ў некаторыя дні зусім хлеба не даюць. Студэнтам прыходзіцца ўвесь час траціць на атрыманьне свайго пайка, што вельмі дрэнна адбіваецца на якасьці вучобы.

Ня лепшая справа ў студэнцкай сталоўцы. Абеды вельмі дрэнныя, пічаўе ня сходзіць са штодзеннага мэню. Ёсьць сьвінаадкормачны пункт пры сталоўцы, але-ж прадукцыя скарыстоўваецца выключна для парцыённых — па 1 р. 60 к. Ці **можа студэнт** харчавацца парцыённымі, калі ён атрымлівае 40 — 50 руб. стыпэндыі ў месяц. Замест добрай пастаноўкі харчаваньня студэнтаў загадчык сталоўкі ганяецца за вялікімі прыбыткамі.

У пачатку чэрвеня 1932 г. у жанце № 43 арганізаваўся трусатнік, у якім было толькі 5 трусоў. Зараз жант мае ўжо 37 штук. На здымках: зьверху тав. Рубін, мыхар жанту № 43 арганізатар трусатніка. Унізе матка-„цыганка" прывяла 11 шт. прыплоду. Справа самец-„цыган" вагой у 5 кгр.

На 2 пленуме ЦСПСБ

Дзеньнік пленуму

Увечары 28 жніўня ў Менску адкрыўся другі пленум цэнтральнага савету прафсаюзаў Беларусі. Пленум аднагалосна зацьвердзіў пастанову прэзыдыуму аб выбраньні тав. **Кавальчука** старшынёй ЦСПСБ.

Бурнымі апладысмэнтамі былі спатканы прыбыўшыя на пленум першы сакратар ЦК КП(б)Б тав. **Гікало**, старшыня СНК тав. **Галадзед** і старшыня ЦКК КП(б)Б тав. **Лычоў.**

З дакладам па першым пытаньні парадку дня пленуму — перабудовы прафработы — выступіў сакратар ЦСПСБ тав. **Кавалёў.**

У сваім дакладзе тав. **Кавалёў** указаў на пэўныя зрухі, якія дасягнуты прафсаюзамі БССР у перабудове прафработы, па аснове ажыцьцяўленьня пастаноў IX зьезду прафсаюзаў СССР і VII зьезду прафсаюзаў БССР. Аднак, разам з гэтым тав. **Кавалёў** рашуча падкрэсьліў і завастрыў увагу пленуму на вельмі марудным ходзе гэтай перабудовы, асабліва невыстарчальна ажыцьцяўляюцца паасобнымі саюзамі гістарычныя ўказаньні тав. **Кагановіча**, якія ён даў на IX зьезьдзе прафсаюзаў па пытаньні перабудовы работы нізавых прафорганаў.

Тав. **Кавалёў** заклікаў членаў пленуму ўзмацніць барацьбу за бальшавіцкую перабудову прафсаюзнай работы на прадпрыемствах, аказваць больш увагі нізавым вытворчым зьвеньням.

Рэвішняе і вячэрняе пасяджэньні 29 жніўня былі прысьвечаны спрэчкам па дакладу тав. **Кавалёва.**



Старшыня ЦСПСБ тав. КАВАЛЬЧУК.

Па-бальшавіцку змагацца за далейшую перабудову прафработы

(*З дакладу сакратара ЦСПСБ т. Кавалёва*)

IX зьезд прафсаюзаў на аснове пастаноў XVI зьезду і XVII партканферэнцыі вызначыў выразныя задачы і ўказаў канкрэтныя шляхі для ўсяго прафруху, ажыцьцяўленьне якіх забясьпечвае далейшыя перамогі на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва.

З часу сканчэньня IX зьезду прафсаюзаў прайшло чатыры месяцы. За гэты час ЦСПСБ правёў рад мерапрыемстваў: сталінскі паход на паляпшэньні рабочага снабжэньня, зьлёты ўдарнікаў, масавую праверку выкананьня калдагавароў і інш.

Правядзеньне ўсіх гэтых мерапрыемстваў дало магчымасьць дабіцца некаторых зрухаў у перабудове нашай работы на прадпрыемствах. Мы маем сотні гаспадарча-разрахунковых брыгад, якія выконваюць і перавыконваюць прамфінпляны. Сярод іх поўнасьцю ліквідавана абязьлічка, цякучасьць рабочай сілы. Іх работа мае вялізнае палітыка-выхаваўчае значэньне для адсталых груп рабочых.

Але нам трэба адзначыць, што ўзоры прыкладнай работы ёсьць далёка не на ўсіх прадпрыемствах. Гэта гаворыць аб тым, што мы яшчэ далёка не завяршылі перабудову нашай прафработы, не навучыліся як сьлед кіраваць па-новаму, ня ўсюды яшчэ ажыцьцяўляецца лёзунг перанясеньня цэнтру цяжару работы ў цэх, брыгаду, групу, агрэгат. Вельмі рэдка мы можам сустрэць, калі фабком заслухоўвае справаздачу групоргаў, каб выявіць недахопы работы і аказаць канкрэтную дапамогу.

Пад кіраўніцтвам партыі наша прамысловасьць у бягучым годзе мае бліскучыя дасягненьні ў справе павялічэньня выпуску валавой прадукцыі. **Па Наркамцяжпраму за 7 месяцаў, параўнальна з гэтым-жа пэрыядам мінулага году, мы маем рост на 24,6 проц., па лёгкай прамысловасьці — на 23,2 проц.** У нас ёсьць рад прадпрыемстваў, якія пабальшавіцку перабудавалі сваю работу і гэтым самым дабіліся сыстэматычнага перавыкананьня сваіх плянаў. **Да такіх прадпрыемстваў адносіцца гарбарня «Бальшэвік», гута «Пралетары», швэйная фабрыка імя Крупскай, галянтарэйная, друкарня ім. Сталіна і віцебская абутковая.**

Аднак, калі ўзяць агульнае становішча з выкананьнем прамфінпляну, то яно далёка нездавальняючае. Як колькасныя, так і якасныя паказальнікі амаль па ўсіх галінах прамысловасьці значна недавыконваюцца.

Няма патрэбы даказваць, што здзяй з асноўных прычын дрэннай работы прадпрыемстваў зьяўляецца няўмелая пастаноўка прафработы. Прафарганізацыі, пачынаючы ад прафгрупы і вышэй, не заўсёды вырашаюць пытаньні барацьбы за прамфінплян, канкрэтна і ў тым, што ня поўнасьцю выкарыстаны мясцовыя рэсурсы (мэталялом). Не хапае кваліфікаваных фармоўшчыкаў. Замест 30 ёсьць усяго 18.

Узрос брак да 7 проц. (паводле пляну зусім не дапускаецца), які сьведчыць аб адсутнасьці барацьбы за ўзьняцьце кваліфікацыі фармоўшчыка, за аўладаньне тэхнікай вытворчасьці, за якасьць працы і вытворчую дысцыпліну.

Сьледам за ліцейным, па яго-ж віне, недавыконваюць плянаў мэханічна-зборачны і цясовы цэхі. Ганебна адстае бляшаны. Ён сваё заданьне ў ліпені выканаў толькі на 29,6 проц. Гэты цэх увесь час адчувае недахват сырцу ў той час, калі пры скарыстаньні ўнутраных рэсурсаў магчыма было не дапусьціць такога глыбокага прарыву. Напрыклад, нехапаючае палоснае жалеза для акоўкі катлоў і бакаў можна замяніць круглым, спачатку апрацаваўшы яго ў кузьні.

Не на належнай вышыні стаіць яшчэ і ўнутрызаводзкае плянаваньне. Вось невялікі, але яркі прыклад. Нядаўна пачалі вырабляць новую картыну помпаў. Плянавы-ж аддзел ня ўлічыў неабходнасьці вырабу падшыпнікаў да іх. У выніку гатовая прадукцыя можа доўгі час стаяць на дварэ нясканчанай.

А як справа з рабочай сілай? Дырэктар бездапаможна разводзіць рукамі.

— Не хапае. Бягуць, ня ўтрымаць ніяк.

Гэта «аб'ектыўная» прычына—вынік невыстарчальнай барацьбы заводзкіх арганізацый за паляпшэньне бытавых умоў рабочых, грамадзкага харчаваньня. Сталоўка—самы адсталы цэх заводу. З-за дрэннай якасьці абедаў у ліпені работнікі сталоўкі былі адданы пад суд. Абноўлена кіраўніцтва і дагэтуль знадворна добраму выгляду і абсталяваньню сталоўкі не адпавядае якасьць яе прадукцыі. Самазагатоўкі разгорнуты зусім слаба.

На гаспадарчы разрахунак пераведзены фармальна ўсе брыгады і цэхі заводу. Ёсьць пэўныя вынікі ў эканоміі мэталю, дапаможных матэрыялаў і інш. Але адсутнічае поўны і дакладны ўлік эфэктыўнасьці работы брыгад і прэміраваньне іх за ўдарную работу.

Выраб тавараў шырокага ўжытку разгорнут ва ўсіх цэхах. Вылучаны спэцыяльныя брыгады. Вызначана і выраблена 17 аб'ектаў тавараў: сякеры, малаткі, шуфлі, і інш. Ліпеньскі плян выканан на 100,6 проц: вытворчана прадукцыі на 38.320 руб. Але завал мэталялому і бракаваных мэталяў у кавальскім цэху, раскіданы лом па ўсёй тэрыторыі заводу, залеж прадукцыі шырокага спажываньня ў цэхах—усё гэта сьведчыць аб тым, што ўцілізацыя адкідаў яшчэ ня стала неадлучнай часткай вытворчасьці. Шырспажывам займаюцца ўсе, а на сутнасьці ніхто. Няма спэцыяльна вылучаных работнікаў для збору, сартаваньня адкідаў. Завод мае магчымасьць работу па вырабу тавараў шырспажыву разгарнуць значна шырэй.

На заводзе ёсьць усе магчымасьці для выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну. Баявая задача партыйных і прафэсыянальных арганізацый—не пастановамі, а рашучай перабудовай работы ўсіх зьвеньняў заводу, на аснове поўнай рэалізацыі 6 умоў т. Сталіна, забясьпечыць пасьпяховае завяршэньне пляну чацьвертага, заключнага, па-баявому ўступіць у другую пяцігодку.

Р—о.

ЗАВОДЗКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ „КАМУНАРА" І „УДАРНІКА" АСЛАБІЛІ ЗМАГАНЬНЕ ЗА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ ШАСЬЦІ ЎМОЎ тав. СТАЛІНА

НА БАРАЦЬБУ З ТЭХНІЧНЫМІ НЕПАЛАДКАМІ

Пяць год назад у Менску, **на Вяземскай вуліцы**, была арганізавана арцель масавага вырабу дзіцячых цацак. У хуткім часе з арцелі нарадзілася новая вялікая фабрыка «Ахраджэньне». Пачалася ўпартая работа. Праз некаторы час была ўстаноўлена машына нямецкай фірмы «Цыбан». Грукаючы тоўстымі ланцугамі, яна паглынала жалеза, ператвараючы яго ў трубныя пруты. Выпускаліся прыгожыя, добрай якасьці ложкі. Новы від прадукцыі радаваў кожнага рабочага фабрыкі.

Узрасталі надбудовы карпусоў, укладваліся дзесяткі тысяч рублёў на ўстаноўку такарных, сьвідравальных і стругальных варштатаў. Замест сьвістулек, размаляваных лялек сталі выпускацца нікеляваныя ложкі, дзесяцічныя вагі і вагі «Фалько».

З арцелі на вырабу цацак вырас мэталёвы завод «Ударнік». Ён становіцца ў рады індустрыяльных прадпрыемстваў і перадаецца ў веданьне Белмэталяб'яднаньня. Уліваліся новыя кадры рабочых, прызвычаіваліся да работы, навучаліся тэхніцы. Расла і загартоўвалася ў барацьбе за прамфінплян партыйная арганізацыя.

Усё ішло добра. Завод выконваў сваё вытворчае заданьне. Але ў другім паўгодзьдзі трэцяга рашаючага завод апынуўся ў глыбокім тыле. Кіраўніцтва апусьціла рукі. Замест мабілізацыі рабочых на ліквідацыю адставаньня гора-кіраўнікі пачалі разважаць аб «нерэальнасьці» пляну, аб «немагчымасьці» яго выкананьня. Ня было належнай дапамогі з боку Белмэталяб'яднаньня. У выніку праграма 1931 году значна недавыканана.

А як-жа цяпер? Ці ўхілы кіраўніцтва заводу памылкі мінулага году? Не. Заводзкі трыкутнік, атрымаўшы кантрольныя лічбы на 1932 год, самазадаволена заляляў:

— Глупства. Мы такое заданьне бязумоўна перакрыем.

Гэтым кіраўніцтва выказала старарасейскае «шапкамі закідаем». Ніякай работы па арганізацыі працы не праводзілася. Не вызначалася магутнасьць варштатаў, нормы выпрацоўкі ўстанаўліваліся на вока. Пагоршвалася становішча з забесьпячэньнем заводу сырцом, але аб гэтым не клапаціліся. Студзень прынёс трывожныя весткі: вытворчая праграма выканана толькі на палову.

Але спакойна сябе адчуваў заводзкі трыкутнік. Ён не турбуецца і зараз. Тэхнічныя непаладкі і дрэнная арганізацыя працы заядаюць. Рабочы ў 8 гадз. раніцы ня ведае, што ён будзе рабіць у 10. Сёньня рабочы працуе ў ліцейным, а на другі дзень яго ставяць у мэханічным. Уладзілаўка ў зарплаце сьцёрла грань паміж кепскай і добрай работай. Роля майстра, брыгадзіра стушавалася. Яны ня ведаюць сваіх правоў і абавязкаў, ім іх не растлумачваюць.

Ніхто з кіраўнікоў-гаспадарнікаў ня ставіць сваёй задачай аўладаць тэхнічным, эканамічным і фінансавым бокам вытворчасьці. Цэхі не пераведзены на гаспадарчы разрахунак, няма ні адной гаспадарча-разрахунковай брыгады.

На пытаньне, што зроблена ў справе рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна, сакратар парткалектыву тав. **Гінзбург** з нявіннай ухмылкай адказаў:

— Нічога ня зроблена. Няма навошта раз ганяцца.

Старшыня заўкому **Ратнэр** валіць усю віну на старога старшыню, сябе вінаватым у прарывах ня лічыць.

Але-ж факт застаецца фактам. Кіраўніцтва заводам не перабудавала сваю работу ў адпаведнасьці з новымі задачамі. Адсюль і ганебныя прарывы ў рабоце. За першае паўгодзьдзе вытворчая праграма выканана ўсяго на 46,7 проц. Недадана краіне прадукцыі на 408 тыс. рублёў. Заданьне па падняцьці прадукцыйнасьці працы недавыкананa на 25 проц. Сабекошт замест зьніжэньня значна павялічыўся.

Ня гледзячы на тое, што ў ліпені завод быў поўнасьцю забясьпечан сырцом, праграма выканана на 28,2 проц. Недадана дзяржаве прадукцыі за адзін месяц на 108 т. р.

Ірарыў патлыбляецца. Дваццаць дзён жніўня далі 26,4 проц. выкананьня. Ці ведаюць аб прарывах рабочыя? Ня ведаюць. Спасыланьні трыкутніка на недахват сырцу ня маюць над сабой ніякіх падстаў. **Няўвазні ў рабоце цэхаў, адсутнасьць канкрэтнага кіраўніцтва, барацьбы за ажыцьцяўленьне 6 умоў тав. Сталіна — вось галоўная прычына адставаньня заводу.**

— Рабочыя ня ведаюць за што ўзяцца, —гаворыць тав. **Шлемовіч**,—за работу ніхто не адказвае. Брыгады развальваюцца. Працуюць усе падзёшна.

— У нас ва ўцільцэху, напрыклад, — заяўляе камсамолец **Шарупін**,—адзін рашпіль і адзін малаток на 7 чал. Вось і выконвай плян. Аб гэтым сотні раз гаварылі, але кіраўнікі ня чуюць.

Работніца тав. **Кундо** намесьніку дырэктара **Карпілаву** са злосьцю кідае:

— Тры пажоўкі сёньня зламалі. Чаму? Таму, што ў кузьні жалеза перагартоўваюць. Штампы падаюцца няправільныя. Мы многа крычым за выкананьне пляну, а практычна ніхто нічога ня робіць.

Аб непаладках у рабоце гавораць усе рабочыя. Яны ўносяць прапановы для паляпшэньня працы, але да іх не прыслухоўваюцца. Токар тав. **Запуцкі** адночы патрабаваў ад майстра **Залельскага** перавесьці яго на зьдзельную работу.

— Навошта табе зьдзельшчына? Па цалковаму ў гадзіну заганяеш і хопіць, — адказаў той.

Работніца мэханічнага цэху тав. **Дорская** прапанавала адрамантаваць балтарэзны варштат, прадукцыйнасьць якога 800 балтоў у зьмену. На сваю прапанову яна атрымала адказ:

— Наразайце ўручную, больш заробіце.

Хаос і безгаспадарчасьць панае ва ўсіх зьвеньнях заводзкай работы. Цякучасьць рабочай сілы вельмі вялікая. За 7 месяцаў прынята 139 новых рабочых, кінула—116 чал. Прагулаў за 7 месяцаў на няўважлівых прычынах налічваецца 885 чалавека-дзён.

За прарывы на заводзе «Ударнік» разам з заводзкім трыкутнікам павінен адказваць дрэваапрацоўчы завод імя Молатава. 1.080 вагавых станкоў, якія атрыманы з дрэваапрацоўчага заводу, аказаліся бяз верхніх накрывак і стоек. Прадукцыя напалову зроблена з гнілога дрэва.

Нарэшце, неабходна спыніцца на кіраўніцтве Белмэталяб'яднаньня сваім заводам. Па сутнасьці яго няма. Шмат цыркуляраў, напамінаньняў, патрабаваньняў, але няма жывой канкрэтнай дапамогі ў перабудове работы, арганізацыі вытворчасьці.

А. М.

„КАМУНАР" ЗДАЕ ПАЗЫЦЫІ

На ўскрайку Менску, дзе пацьелепаватымі вокнамі ўрасталі ў зямлю хібаркі, на восьці старой ліцейні былога гаспадара Якабсона, вырас машынабудаўнічы завод «Камунар». Ад невялікай аўтарамонтнай майстэрні з 50 рабочымі ў 1923 годзе, да буйнага мэталяапрацоўчага прадпрыемства з тысячным калектывам рабочых, паравымі малатамі, сьвідравальнымі варштатамі, штампамі—такі кароткі шлях тэхнічнага ўзбраеньня заводу.

Ён выконвае заказ сацыялістычнага будаўніцтва—выпускае камнядрабілкі, гонтарэзкі, такарныя, бэтонныя і сьвідравальныя варштаты, помпы, ціскі і, нарэшце, вёдры, шуфлі, сякеры, малаткі, кіпацільнікі, нажы і засланкі—тавары шырокага ўжытку.

«**Камунар**» мае ня дрэннае мінулае. У другім годзе пяцігодкі за перавыкананьне прамфінпляну ён атрымаў чырвоны сьцяг. Але ў **трэцім рашаючым і асабліва ў чацьвертым заключным завод здаў заваяваныя пазыцыі.** Праграма па машынабудаўніцтву за першае паўгодзьдзе 1932 году выканана на 82,1 проц., цэхам ціскоў—на 84,6 проц., бляшаным—на 61 проц. У ліпені агульнае выкананьне пляну на заводу складае 65,4 проц., за дзьве дэкады жніўня—31,3 проц. Недадана дзяржаве прадукцыі на 600 тыс. руб.

Для характарыстыкі работы дамо слова лічбам: у першым квартале завод быў забясьпечан рабочай сілай на 105 проц., у другім—на 89,5 проц., а ў трэцім крывая значна апынулася. Прагулы ў чэрвені складалі 172 чалавекадні, у ліпені—210. Ліцейны цэх—вядучы на вытворчасьці—забясьпечыў ліцьцём завод у першым паўгодзьдзі на 63 проц. Прычына гэтага ня толькі ў недаатрыманьні чыгуну-сырцу, але і ў тым, што ня поўнасьцю выкарыстаны мясцовыя рэсурсы (мэталялом). Не хапае кваліфікаваных фармоўшчыкаў. Замест 30 ёсьць усяго 18.

Узрос брак да 7 проц. (паводле пляну зусім не дапускаецца), які сьведчыць аб адсутнасьці барацьбы за ўзьняцьце кваліфікацыі фармоўшчыка, за аўладаньне тэхнікай вытворчасьці, за якасьць працы і вытворчую дысцыпліну.

Сьледам за ліцейным, па яго-ж віне, недавыконваюць плянаў мэханічна-зборачны і цясовы цэхі. Ганебна адстае бляшаны. Ён сваё заданьне ў ліпені выканаў толькі на 29,6 проц. Гэты цэх увесь час адчувае недахват сырцу ў той час, калі пры скарыстаньні ўнутраных рэсурсаў магчыма было не дапусьціць такога глыбокага прарыву. Напрыклад, нехапаючае палоснае жалеза для акоўкі катлоў і бакаў можна замяніць круглым, спачатку апрацаваўшы яго ў кузьні.

Не на належнай вышыні стаіць яшчэ і ўнутрызаводзкае плянаваньне. Вось невялікі, але яркі прыклад. Нядаўна пачалі вырабляць новую картыну помпаў. Плянавы-ж аддзел ня ўлічыў неабходнасьці вырабу падшыпнікаў да іх. У выніку гатовая прадукцыя можа доўгі час стаяць на дварэ нясканчанай.

А як справа з рабочай сілай? Дырэктар бездапаможна разводзіць рукамі.

— Не хапае. Бягуць, ня ўтрымаць ніяк.

Гэта «аб'ектыўная» прычына—вынік невыстарчальнай барацьбы заводзкіх арганізацый за паляпшэньне бытавых умоў рабочых, грамадзкага харчаваньня. Сталоўка—самы адсталы цэх заводу. З-за дрэннай якасьці абедаў у ліпені работнікі сталоўкі былі адданы пад суд. Абноўлена кіраўніцтва ЗРК. Але і дагэтуль знадворна добраму выгляду і абсталяваньню сталоўкі не адпавядае якасьць яе прадукцыі. Самазагатоўкі разгорнуты зусім слаба.

На гаспадарчы разрахунак пераведзены фармальна ўсе брыгады і цэхі заводу. Ёсьць пэўныя вынікі ў эканоміі мэталю, дапаможных матэрыялаў і інш. Але адсутнічае поўны і дакладны ўлік эфэктыўнасьці работы брыгад і прэміраваньне іх за ўдарную работу.

Выраб тавараў шырокага ўжытку разгорнут ва ўсіх цэхах. Вылучаны спэцыяльныя брыгады. Вызначана і выраблена 17 аб'ектаў тавараў: сякеры, малаткі, шуфлі, і інш. Ліпеньскі плян выканан на 100,6 проц: вытворчана прадукцыі на 38.320 руб. Але завал мэталялому і бракаваных мэталяў у кавальскім цэху, раскіданы лом па ўсёй тэрыторыі заводу, залеж прадукцыі шырокага спажываньня ў цэхах—усё гэта сьведчыць аб тым, што ўцілізацыя адкідаў яшчэ ня стала неадлучнай часткай вытворчасьці. Шырспажывам займаюцца ўсе, а на сутнасьці ніхто. Няма спэцыяльна вылучаных работнікаў для збору, сартаваньня адкідаў. Завод мае магчымасьць работу па вырабу тавараў шырспажыву разгарнуць значна шырэй.

На заводзе ёсьць усе магчымасьці для выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну. Баявая задача партыйных і прафэсыянальных арганізацый—не пастановамі, а рашучай перабудовай работы ўсіх зьвеньняў заводу, на аснове поўнай рэалізацыі 6 умоў т. Сталіна, забясьпечыць пасьпяховае завяршэньне пляну чацьвертага, заключнага, па-баявому ўступіць у другую пяцігодку.

Р—о.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

Выкарыстаньне адкідаў леса пільных і дрэваапрацоўчых заводаў для вырабу крафт-цэлюлёзы

Разгортваньне папяровай прамысловасьці Саюзу ССР у другую пяцігодку патрабуе вышуканьня новых відаў сырцу, пабудовы новых папяровых фабрык і максымальнага выкарыстаньня існуючых прадпрыемстваў. Адным з відаў новага сырцу могуць зьявіцца адкіды лесапільных і дрэваапрацоўчых заводаў.

Папяровая сэкцыя навукова-дасьледчага інстытуту прамысловасьці БССР прарабіла вопыты варкі адкідаў ялоцкай і хваёвай драўніны больш хуткім спосабам, чым звычайна. Замест 4—5 гадзін крафт-цэлюлёза была атрымана за адну гадзіну, і па якасьці яна ня ўступае звычайнай цэлюлёзе. Паскарэньне варкі ідзе за лік павялічэньня ціску — замест 6—7 атмасфэр драўніна варыцца пры 10 атмасфэрах.

Гэты спосаб варкі паскарае ў 3—4 разы атрыманьне цэлюлёзы, г. зн. дасьць пры адным і тым-жа абсталяваньні ў 3—4 разы больш цэлюлёзы, чым пры звычайнай варцы.

Лабараторныя досьледы ўжо скончаны. Зараз інстытут будзе праводзіць праверку ў заводзкім маштабе.

Спосаб хуткай варкі дасьць магчымасьць больш поўна выкарыстаць адкіды дрэваапрацоўчай прамысловасьці, якіх налічваецца каля 193 тыс. кбм. у год і якія даюць каля 40 тыс. тон цэлюлёзы.

Пачата прамысловая эксплёатацыя чацьвертага агрэгату Дняпроўскай гідра-электрычнай станцыі

КІЧКАС, 26. 25 жніўня пасьля канчатковага выпрабаваньня, пастаўлен пад прамысловую нагрузку чацьверты гідра-генэратар Дняпроўскай электрастанцыі. Такім чынам, з пушчаных пяці агрэгатаў першай чаргі чаты ры ўжо ўступілі ў эксплёатацыю.

Пачынаючы з 25 жніўня, 4-ты генэратар выпрацаваў 45.000 квт. гадзін самай танпай у сьвеце электраэнэргіі.

Усяго Дняпрапятроўская гідра-электрастанцыя ўжо выпрацавала 28.205 тысяч квт.-гадзін.

Сканструяваны новы горны камбайн

КАДЗІЕЎКА. Мэханік першамайскага руда кіраўніцтва **тав. Бахмуцкі** сканструяваў горны камбайн. Выпрабаваньні камбайну паказалі надзвычай добрую якасьць.

Горны камбайн працуе ў 100-мэтравай лаве. Адначасова зарубае, адбівае і навальвае вугаль, замяняючы на адзін цыкль 12 навальшчыкаў, 6 адбойшчыкаў і два бурыльшчыкі. **Камбайн мэханізуе самыя цяжкія працаёмкія працэсы вугляздабычы.**

Вайна падпальшчыкам імпэрыялістычнай вайны

Самыя шырокія масы працоўных усяго сьвету салідарны з антываенным кангрэсам

АМСТЭРДАМ, 27. Даклад **Барбюса** быў спатканы бурнымі апладысмэнтамі. Пасьля дакладу былі зачытаны прывітальныя тэлеграмы, атрыманыя з усіх канцоў сьвету. З энтузіязмам была спаткана тэлеграма з Італіі, у якой рэвалюцыйныя рабочыя выказвалі сваю салідарнасьць з антываенным кангрэсам. Дэлегаты, стоячы, сьпявалі італьянскую рэвалюцыйную песьню «**Бандэра Росэ**» (чрывоны сьцяг).

Далей былі зачытаны тэлеграмы чатырох арганізатараў і барацьбітоў за антываенны кангрэс, якія не змаглі прыняць у ім удзелу—**Рамэн Раляна**, германскага вучонага **праф. Эйнштэйна, Клары Цэткін** і германскага пісьменьніка **Генрыха Мана.**

Цяжка хворы **Рамэн Ралян** у сваёй тэлеграме вітае ўсіх тых, хто адгукнуўся на заклік да барацьбы супроць імпэрыялістычнай вайны, і рэзка асуджае тых, хто прабаваў навязваць грамадзкую думку супроць антываеннага кангрэсу. Рамэн Ралян ганьбіць бюракратаў, якія пануюць у сацыял-дэмакратычных партыях і якія змагаюцца супроць усяго, што здаецца ім замахам на іх бюракратычную руціну. Ралян заклікае прыняць у вялізарную армію барацьбітоў за мір усіх тых, хто мае перад сабою адну ясную мэту—**вайна імпэрыялістычнай вайне.** Вялікі францускі пісьменьнік ганьбіць таксама тых, хто абмяжоўваецца дэкларацыямі і выступае супроць кангрэсу.

Рамэн Ралян лічыць неабходным аб'яднаць усе паасобныя выступленьні ў адно магутнае масавае выступленьне, выкарыстаць рух адмаўленьня ад вайсковай службы, як сродак антываеннай барацьбы. Ралян падрабязна аналізуе палітычнае становішча ў паасобных краінах. **Германія** знаходзіцца пад пагрозай фашысцкага перавароту. **Францыя** прыдушана панаваньнем залатога мяшка і цяжкай прамысловасьці. **Англія** вядзе жорсткую барацьбу са сваімі дамініёнамі, у **ПАЗШ** пануе жорсткі сацыяльны крызіс. Ён апісвае барацьбу за свабоду Індыі і ганьбіць вайну, у выніку якой японскія імпэрыялісты дабраліся да самага сэрца Кітаю.

Усім гэтым краінам Рамэн Ралян процістаўляе Савецкі саюз—першую пралетарскую дзяржаву—і ставіць у прыклад яе для ўсіх прыгнечаных народаў. Ралян падкрэсьлівае, што абарона гэтай дзяржавы супроць імпэрыялістычнай вайны зьяўляецца першым абавязкам усіх працоўных.

Далей вялікі пісьменьнік канстатуе, што інтэлігенцыя ня можа існаваць бяз мас і што сапраўдныя інтэлігенты, вартыя гэтай назвы, павінны весьці антываенную барацьбу разам з асноўнымі змагарамі—працоўнымі масамі. Лёс надыходзячай вайны,—заяўляе Рамэн Ралян,—знаходзіцца ў руках пралетарыяту. Ад яго залежыць тое, ці будзе імпэрыялістычная вайна задушана ў самым корані. А роля інтэлігенцыі заключаецца ў тым, каб адказнасьць рабочай клясы за лёс імпэрыялістычнай вайны зрабіць сваёй адказнасьцю. Ад гэтага залежыць лёс усяго сьвету».

Праф. Альбэрт Эйнштэйн заяўляе ў сваёй тэлеграме: «Калі японды напалі на Манчжурыю, цывілізаваны сьвет не знайшоў у сябе досыць сіл, каб перашкодзіць гэтаму злачынству. Грашовыя інтарэсы зацікаўленых у вайне прамыслоўцаў зрабіліся мацнейшымі, чым жаданьне народаў справядлівасьці. Усе прыхільнікі здаровага разьвіцьця народаў, якіх-бы эканамічных пераконаньняў яны ня прытрымліваліся, павінны накіраваць увесь свой уплыў да таго, каб дабіцца, каб месца грубога гвалту і бязьмежнай прагнасьці нажывы, заняло нарэшце права мірнага вырашэньня канфліктаў. Кожны, хто спакойна наглядае, як адбываецца напад на нашу культуру, таксама нясе адказнасьць за гэты напад».

Найвялікшае ў гісторыі перасяленьне народаў

АМСТЭРДАМ. 28 жніўня пасяджэньне Амстэрдамскага антываеннага кангрэсу адкрылася прамовай вядомага скандынаўскага пісьменьніка **Марціна Нэксэ.** Спатканы бурнымі апладысмэнтамі, Нэксэ ў сваёй прамове заявіў: «Мы сёньня перажываем найвялікшае ў гісторыі перасяленьне народаў. 90 проц. чалавецтва знаходзіцца на шляху... да чалавечнасьці. Як мэта гэтага перасяленьня народаў, стаіць Савецкі саюз. Мы ведаем, што Эўропа знаходзіцца ў агоніі. Сусьветны і эўрапэйскі капіталізм, асуджаны на сьмерць, хоча зьнішчыць разам з сабою і ўсё. Але пралетарскія масы, якія імкнуцца жыць, хочуць і могуць сапраўды супраціўляцца гэтай злачыннай спробе.

Барацьба супроць вайны ў асноўным зьяўляецца і барацьбой супроць фашызму».

Пасьля Нэксэ з прамовай выступіў прадстаўнік рэвалюцыйнай меншасьці францускай партыі **Уй.** Ён пажэрсьліў, што рэвалюцыйная меншасьць францускай партыі ўсімі сіламі супраціўляецца імпэрыялістычнаму кіраўніцтву гэтай партыі. Меншасьць францускіх сацыялістаў заяўляе,—кажа Уй,—што ўсе буржуазныя сродкі і спробы перашкодзіць новым войнам ня маюць ніякай цаны.

Абарона Савецкага саюзу зьяўляецца галоўнейшай задачай усіх шчырых ворагаў імпэрыялістычнай вайны».

Прывітаньне міжнароднага аб'яднаньня рэвалюцыйных пісьменьнікаў

АНТЫВАЕННЫ КАНГРЭС, АМСТЭРДАМ. ТАВ. БАРБЮСУ.

Сакратарыят Міжнароднага аб'яднаньня рэвалюцыйных пісьменьнікаў шле дэлегатам антываеннага кангрэсу палкае рэвалюцыйнае прывітаньне ад імя сваіх сэкцый у капіталістычных і калёніяльных краінах.

Магутны водгук, спатканы адозвай **Горкага, Рамэна Раляна і Барбюса** ў працоўных масах і сярод інтэлігенцыі, сьведчыць аб узрастаючым зразуменьні нагрозы вайны і небясьпекі інтэрвэнцыі, якая набліжаецца, і аб непахіснай волі да барацьбы найшырэйшых пластоў работнікаў фізычнай і разумовай працы.

Цяпер больш чым калі-небудзь неабходна стварэньне жалезнага баявога фронту супроць зачынышчыкаў імпэрыялістычнай вайны і дапаможнікаў з лягеру міжнароднай сацыял-дэмакратыі. **Барацьба супроць вайны азначае барацьбу супроць капіталістычнага наступленьня, супроць фашысцкага тэрору, супроць культурнай рэакцыі і барбарства,** супроць сацыял-дэмакратычнага здрадніцтва,—азначае барацьбу за стварэньне **адзінага фронту камуністычных, сацыял-дэмакратычных і беспартыйных работнікаў фізычнай і разумовай працы для барацьбы за перамогу пралетарскай рэвалюцыі.**

Жадаем, каб ваш кангрэс і надалей быў яркім сьветачам, які садзейнічаў-бы мабілізацыі ўсіх эксплёатаваных у капіталістычных і калёніяльных краінах **на барацьбу з вайной, на абарону Савецкага саюзу—бацькаўшчыны ўсіх працоўных.**

Па даручэньні сакратарыяту МАРП:
А. ГІДАШ, С. ТРАЦЬЦЯКОЎ,
Я. ВІСЬЛЯК.

ПРЫВІТАЛЬНАЯ ТЭЛЕГРАМА МАКСІМА ГОРКАГА

БЭРЛІН, 27. Максім Горкі адправіў з Бэрліну кангрэсу наступную тэлеграму:

«Ад імя савецкай дэлегацыі горача вітаю кангрэс. Жадаю членам кангрэсу поўнай і глыбокай адпадушнасьці ў іх адмоўных адносінах да імпэрыялістаў, арганізатараў новай сусьветнай бойні. На жаль, урадам Галяндыі я пазбаўлен права прымаць непасродны ўдзел у кангрэсе. **Я не адмаўляю за ворагам яго права на трусасьць,** але ў даным выпадку трусасьць здаецца мне незразумелай.

Частка прэсы Галяндыі цьвердзіць, што кангрэс—«справа рук Масквы». Мне здаецца, што цьвярджэньню гэтаму супярэчыць факт удзелу ў кангрэсе некалькіх соцень людзей, якія знаходзяцца ў II Інтэрнацыянале. Потым, напэўна, большасьць дэлегатаў прыцягнута ў Амстэрдам ня столькі іх сацыяльнай сымпатыяй да Савецкага саюзу і яго мірнай палітыкі, колькі іх натуральным пачуцьцём самаабароны і іх біалёгічнай антыпатыяй да вайны, якая замышляецца імпэрыялістамі. Ня думаю, што гэта частка дэлегатаў абрадавана недапушчэньнем савецкай дэлегацыі, дэлегацыі тэй краіны, **якая заўсёды і пастаянна рашуча прапанавала поўнае і ўсеагульнае раззбраеньне.**

Галяндзкі ўрад паказаў рабочай клясе ўсяго сьвету, хто яго вораг, хто прыяцель. Гэта—вельмі добра.

Яшчэ раз сардэчнае прывітаньне кангрэсу і гарачае пажаданьне аднадушнасьці, пачуцьця і мысьлі.

Двудушнасьць галяндзкіх сацыял-прахвостаў

АМСТЭРДАМ, 28. Галяндзкая буржуазная прэса, камэнтуючы антываенны кангрэс, бярэ свае аргуманты для цкаваньня кангрэсу пераважна з сацыял-дэмакратычных газэт і органаў рэфармісцкіх прафсаюзаў. Цяпер, пасьля недапушчэньня на зьезд савецкай дэлегацыі, сацыял-дэмакратычная прэса ў сувязі з абурэньнем сацыял-дэмакратычных рабочых мас, раптам зьмяніла тон і стала крытыкаваць мерапрыемствы галяндзкага ўраду супроць кангрэсу, робячы выгляд, што яна не нясе ніякай адказнасьці за гэтыя дзеяньні ўраду. Цяпер пасьля адкрыцьця кангрэсу сацыял-дэмакратычная прэса крывадушна «патрабуе» прадастаўленьня візы на ўезд усім дэлегатам кангрэсу.

ПРАГРАМНАЯ ПРАМОВА ФОН-ПАПЭНА

БЭРЛІН, 28. Агенцтва Вольф паведамляе: «На зьезьдзе заходня-германскіх сялянскіх саюзаў у Мюнстэры (Вэстфалія) выступіў рэйхсканцлер фон-Папэн з вялікай праграмнай прамовай, у якой ён падаў прынцыпы кансэрватыўнага кіраўніцтва дзяржавай.

Урад,—заявіў рэйхсканцлер,—поўны рашучасьці не дапусьціць скрытай грамадзянскай вайны і дабіцца прызнаньня роўных праў для ўсіх нямецкіх грамадзян. Дзяржаўная ўлада не павінна быць прадметам палітычнай гульні партый у парляманце. Урад ня думае зьмяняць канстытуцыю, або зьмяняць форму дзяржаўнага кіраўніцтва. Ён, аднак, бачыць цэнтр цяжару дзяржаўнай улады ў дэмакратычнай пасадзе прэзыдэнта.

Рэйхсканцлер адхіліў дзяржаўнае ўмешваньне ў сварку прыватнай гаспадаркі і падаў на гэтай базе гадавы плян па барацьбе з беспрацоўем—гэтай цэнтральнай праблемай германскага крызісу. Апрача тых мер, што праводзіліся да гэтага часу, як гражданскія работы і «дабраахвотная» працоўная павінасьць, урад адпусьціць звыш 2 млрд. марак на аднаўленьне і нагружу прамысловага апарату германскай гаспадаркі. Фінансаваньне будзе праведзена ня шляхам прамысловай пазыкі, а пры дапамозе выпуску падатковых аблігацый на паўтары мільярды, якія будуць выданы гаспадарчым прадпрыемствам і прадпрыемцам. Работадаўцы павінны заахвочвацца падатковымі прэміямі, а таксама і палягчэньнямі ў галіне тарыфнай сыстэмы зарплаты, не зьмяншаючы пры гэтым жыцьцёвага мінімуму з тым, каб прыцягваць новую рабочую сілу. Асобныя мерапрыемствы будуць праведзены, каб перашкодзіць закрыцьцю прадпрыемстваў. Рэйхсканцлер заявіў аб тым, што мае адбыцца неадкладнае зьніжэньне вуточнай стаўкі і далейшыя мерапрыемствы ў галіне кошту крэдыту. Рэйхсканцлер мае намер у хуткім часе зрабіць рэйхстагу падрабязныя заявы аб унутрыпалітычным і замежным становішчы краіны (ТАСС).

ХРОНІКА

* Інстытутам аздараўленьня і арганізацыі працы пры НКП БССР на торфараспрацоўках «Чырвоны сьцяг» праведзен рад навуковых работ па прыстасаваньні псыха-тэхнічных мэтадаў для разстаноўкі рабочай сілы на элеватарных агрэгатах па вызначэньні рацыянальна іх рэжыму рабочага дня, на лепшым скарыстаньні трактараў на фрэзарных палёх і інш.

* Яўсэктар БАН выпускае з друку наступныя працы па пытаньнях літаратуразнаўства: «**За магнітабуды ў літаратуры**» Дунца і «**Праблемы ленінскага этапу ў літаратуразнаўстве**» Брэнштэйна. Гэтымі днямі выходзіць з друку яўрэйска-беларускі слоўнік.

* Беларуская арганізацыя МОПР'у ўключылася ў работу па падрыхтоўцы да міжнароднага кангрэсу МОПР'у, які адбудзецца ў Маскве ў лістападзе г. г.

* З новага навучальнага году ў БССР адкрываюцца **2 новыя рабфакі—польскі пэдагагічны ў Дзяржынску і беларускі—ў Сьвіслачы.**

* Выходзіць першы нумар новай штомесячнай часопісі «**Мастацтва і рэвалюцыя**» пад рэдакцыяй **В. Вольнага** (адк. рэдактар), **А. Платуна, Іл. Гурскага, Медэля, Александровіча, Турэцкага, Грубэ, Гіттарца, Гурчанкі і Шомшура.** У часопісі будуць друкавацца матар'ялы па пытаньнях тэатру, кіно, самадзейным і выяўленчым мастацтве, музыцы, будзе шырока асьвятляцца ўсё мастацкае жыцьцё БССР, савецкіх рэспублік і капіталістычных краін.

* 1 верасьня адкрываецца ў Воршы пэдінстытут, які будзе рыхтаваць настаўнікаў другога і трэцяга канцэнтраў.

* Прыём рукапісаў на конкурс-спаборніцтва памёж пісьменьнікамі, драматургамі і кампазытарамі на напісаньне літаратурна-мастацкіх твораў да XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, якіі быў абвешчан Галоўмастацтвам, НКА БССР, ЦСПСВ, ДВБ і Драмтаварыствам у сакавіку г. г., адтэрміноўваецца да 29 кастрычніка г. г.

* 1 верасьня ў **Менску адбудзецца фізкульт прабег, прысьвечаны МЮД'у і дню вучобы.** У ім прымаюць удзел усе фізкультурныя калектывы г. Менску.

* З 1 лістапада адкрываюцца два дашкольныя тэхнікумы, з іх адзін польскі ў Дзяржынску.

* Па мэталяаб'яднаньнях БССР за першае паўгодзьдзе бягучага гаспадарчага году ад праведзеных рацыянізатарскіх мерапрыемстваў **атрымана эканоміі 78.295 руб.** Па Торфааб'яднаньні—34.015 руб.

* Геалёгічная партыя інстытуту геалёгіі БАН закончыла гідра-геалёгічныя дасьледваньні ў Жлобынскім раёне па адлегласьці 3.000 кв. клм. Знойдзены значныя матар'ялы для керамічнай прамысловасьці.

* Брагінска-Ручаёўскай партыяй геалёгаў знойдзены паклады бурых жалезьнякоў.

Як у Сіроціне знайшлі „клясавага ворага“

Справа фактычна пачалася пасьля таго, як на старонках сіроцінскай раённай газэты «**Ленінскі шлях** (№ 21, 6 ліпеня) зьявілася кароценькая ў 20 радкоў заметачка з грозным, безапэляцыйным патрабаваньнем замест загалоўка: «**ПРЫЦЯГНУЦЬ ВАРАБ'ЁВЫХ ДА СУРОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ»!** У гэтай заметцы нехта В. В. А. паведамляў чытачоў аб тым, што

«**Па даручэньні райкому МОПР і сходу жанчын м. Шуміліна вылучаны 5 лепшых актыўных дэлегатаў па распаўсюджваньні пазыкі «4 заключнага году пяцігодкі».**

«Лепшыя актыўныя жанчыны Антоньнікава і Харытановіч узяліся па-ўдарнаму за рэалізацыю пазыкі. Іх абавязацельства —распаўсюдзіць пазыкі на 1.500 руб.

Узяўшы абавязак, яны з гонарам яго выконваюць».

Спакойнасьць у заметцы не парушаецца аж да апошняга абзацу:

«**27 ЧЭРВЕНЯ клясавы вораг пішэнец ВАРАБ'ЁЎ З СВАЕЙ ЖОНКАЙ І ДАЧКОЙ ЗРАБІЛІ НАПАД НА АНТОНЬНІКАВУ І ХАРЫТАНОВІЧ.**

Патрабуем безадкладнага паказальнага суду».

Скупы на словы аўтар не дае нам выразнага акрэсьленага ўяўленьня аб характары і дэталях «**нападу клясавага ворага—пішэнца**» на актыўных жанчын дэлегатак. Аднак, гэта няведаньне напэўна не датычыць рэдакцыі «Ленінскага шляху». Інакш не маглі-б у гэтым-жа нумары і на тэй-жа старонцы за подпісам работнікаў сіроцінскай ашчадкасы Місунова, Антоньнікава, Навумчыка і інш. зьявіцца наступныя радкі:

«**РАШУЧА ПРАТЭСТУЕМ.**

Мы, работнікі райашчадкасы рашуча пратэстуем супроць нападу клясавага ворага Вараб'ёва з яго жонкай і дачкой на дзьвёх актыўных жанчын: Антоньнікаву і Харытановіч.

Просім належныя органы прыняць рашучыя меры да клясавых ворагаў Вараб'ёвых, якія прымаюць усе захады да эрыву распаўсюджваньня пазыкі «4 заключнага году пяцігодкі».

Пасьля такога настойлівага патрабаваньня работнікаў ашчадкасы будзе зусім нармальна, калі чытач зробіць вывад, што разьюшаны «клясавы вораг і пішэнец» Вараб'ёў, пры дапамозе «злачынцаў»—сваёй жонкі і дачкі—у захапленьні клясавай помстаю напаў на працоўных жанчын-актывістак і прымусіў іх аддаць яму сабраныя па падпісцы грошы і атрыманыя ў ашчадкасе аблігацыі.

Аднак, як ня дзіўна, падобны вывад будзе па сваёй сутнасьці дыямэтрально процілеглым таму, што было ў сапраўднасьці. А ў сапраўднасьці было вось што:

«Клясавы вораг і пішэнец» Вараб'ёў—ня хто іншы, як **73-ГАДОВЫ ПРАЛЕТАРЫ,** які каля **40 ГОД ПРАЦАВАЎ ЧОРНАРАБОЧЫМ-ДРОВАКЛАДАМ НА ЧЫГУНЦЫ,** які зараз **атрымлівае ад савецкай дзяржавы пэнсію.** Яго дачка—Вараб'ёва Ганна—**працуе ў сталовай у якасьці афіцыянткі.** Яны абое **КАРЫСТАЮЦЦА** выбарчым правам і не чакаючы Антоньнікавай і Харытановіч падпісаліся на пазыку «4 заключнага году пяцігодкі». Іменна **не чакаючы,** бо калі-б пачакалі з падпіскай, адклалі-б яе да таго часу, калі прыдуць да іх Антоньнікава і Харытановіч і падпісаліся-б у апошніх—усё было-б добра.

А так выйшаў «інцыдэнт».

«Выконваючы з гонарам свой абавязак» па распаўсюджваньні пазыкі, Антоньнікава і Харытановіч зайшлі да Вараб'ёвых і запрапанавалі апошным падпісацца. Прапанова была адхілена, бо Вараб'ёвы—бацька і дачка—ужо да гэтага часу прынялі ўдзел у падпісцы, а другі раз падпісвацца ня мелі ніякай патрэбы. Калі-ж Антоньнікава і Харытановіч пачалі беспадстаўна патракаць іх зрывам падпіскі і клясава-варожымі настроямі, Вараб'ёвы прапанавалі дэлегаткам выйсьці з памяшканьня. Вось і ўсё. Такі сапраўдны зьмест «нападу», такі сапраўдны твар «клясавых ворагаў».

Выпуск кожнай дзяржаўнай пазыкі ў Савецкім саюзе ёсьць перш за ўсё ажыцьцяўленьне ініцыятывы, волі гаспадара сацыялістычнай дзяржавы—рабочае клясы, цьвёрдага жаданьня мільённых мас працоўных дапамагчы сваёй дзяржаве ў самы кароткі гістарычны тэрмін пабудаваць бясклясавае сацыялістычнае грамадзтва. Тыя максымальна кароткія тэрміны, у якія на аснове поўнай добраахвотнасьці, у рэзультаце шырока разгорнутай растлумачальнай работы партыйнымі, прафсаюзнымі і савецкімі арганізацыямі рэалізуецца дзяржаўная пазыка на пашых прадпрыемствах, у саўгасах і калгасах—ёсьць лепшы паказальнік усё ўзрастаючай палітычнай актыўнасьці шырокіх працоўных мас, паляпшэньня іх добрабыту.

Як відаць, не зразумець гэтай аксыёмы сіроцінскім ура-адміністратарам.

Толькі гэтым можна вытлумачыць узьнікненьне такога беспадстаўнага і цяжкага абвінавачаньня, якое было прад'яўлена Вараб'ёву раённай газэтай.

Але што гэта абвінавачэньне ў параўнаньні з тымі падзеямі, якія пасьледавалі пасьля апублікаваньня заметкі таямнічага аўтара В. В. А. і гістэрычнага «Рашучага пратэсту».

Справа аб «нападзе» была падхоплена ня менш за сваіх саслужыўцаў прыткім сіроцінскім пракурорам **Панковым.** Панкоў неадкладна даў справе ход. Вараб'ёў і яго дачка, з мэтай ня даць ім «скрыць ад суда сьледзтва» (?), былі арыштаваны і пасаджаны пад варту. Урэшце, пасьля так званага сьледзтва, у якім, да рэчы, рашаючую ролю адыгралі «эьпяважаныя» Антоньнікава і яе муж—загадчык ашчадкасы—Вараб'ёвы апынуліся перад судом.

Як-жа аднёсься да гэтай справы Вараб'ёва сіроцінскі народны судзьдзя Сяўніцкі? Лепш за ўсё гэта відаць з рэдакцыйнага артыкулу «Ленінскага шляху»:

«**ФОКУСЬНІКІ З НАРСУДА**»

Пад гэтым, па меншай меры безадказным, загалоўкам рэдакцыя «Л. Ш.» з яўным абурэньнем пачынае з таго, што ў свой час газэта па сваіх старонках давала:

«**запіючы (?) факт выпазкі клясавага ворага—Вараб'ёвых... факт сугуба палітычнага зьместу, але судзьдзя з ім зрабіў непадражаемы (?)... фокус (!!)**

ВАРАБ'ЁВЫ,—заяўляе далей абураная «несправядлівасьцю» рэдакцыя, — ПАБІЎШЫ (?) ЖАНЧЫН, ІМКНУЎШЫСЯ ЗРЫВАЦЬ КАМПАНІЮ, АТРЫМАЛІ ЎМОЎНА 6 МЕСЯЦАЎ...

... Вось так грохнуў судзьдзя...»

бязглузда і няпісьменна ўсклікае газэта і робіць вывад:

«**У сапраўднасьці суд ня скончыўся, пракуратура павінна хутка рэагаваць на агідны факт скажэньня рэвалюцыйнай законнасьці.**

Пустата, недаум'е, палітычная блізарукасьць судзьдзі ня можа ўзьдзейнічаць на праўдзівы ход справы.

Вараб'ёвы ад'яўленыя клясавыя ворагі, якія ствараюць клясавую небясьпеку (?) павінны быць асуджаны на падставе савецкіх законаў і бяз фокусаў нарсудзьдзі».

Адным словам—«памры Дзяніс, а лепш не напішаш».

Даводзіць спачатку аб палітычнай шкодлівасьці і няправільнасьці такога рэзюмэ газэты, гэта значыць ламацца ў адкрытыя дзьверы. Аднак, мы згодны з рэдакцыяй, што «пустата, недаум'е і палітычная блізарукасьць судзьдзі» бязумоўна мелі месца. Толькі не таму, што ён мякка падышоў да пакараньня Вараб'ёвых, як гэта здаецца рэдакцыі, а таму, што ён разам з рэдактарам, загадчыкам ашчадкасы і пракурорам судзіў Вараб'ёва і гэтым самым парушыў рэвалюцыйную законнасьць.

Мы лічым, што з гэтае справы адпаведныя органы зробяць належныя вывады, канкрэтныя ід зейсныя.

УЛ. ЗЛЬ.
ВІТ. ДАЛЬ.

Ч. В. А. адказнага рэдактара А. МІТЛІН.

РАСКЛАД

радыё-лекцый на ВЕРАСЕНЬ 1932 г. Інстытуту Масавага Завочнага Навучаньня партактыву (ІМЗО) пры ЦК КП(б)Б

Лекцыі перадаюцца штодзённа апрача 6, 12, 18, 24 і 30) увечары ад 19 да 20 гадз. і раніцою—ад 8 да 9 гадз. праз Менскую радыё-станцыю імя СНК БССР.

РВ—10, хваля 1105 мэтраў.

Лекцыі перадаюцца штодзённа (апрача 6, на наступны дзень раніцою.

Аб зьмонах у раскладзе кожны раз будзе папярэдня паведамляцца.

1. ДЛЯ ЗАВОЧНАГА КАМВУЗУ

1-IX.—Па палітэканоміі на тэму «Грошы». Лекцыя тав. **Бэшкевіча.**

7-IX.—Па палітэканоміі на тэму «Дадатковая вартасьць» Лекцыя тав. **Скумана.**

19-IX.—Па палітэканоміі на тэму «Заработная плата». Лекцыя тав. **Левіта.**

29-IX.—Па гісторыі рэвалюцыйнага руху. Лекцыя **тав. Стальнога.**

2. ДЛЯ ЗАВОЧНАЙ САЎПАРТШКОЛЫ І КАМСАМОЛЬСКАГА УНІВЭРСЫТЭТУ (ДЛЯ ВЕСНАВОГА НАБОРУ).

13-IX.—Па палітэканоміі на тэму: «Тавар». Лекцыя тав. **Марозава.**

25-IX.—Па палітэканоміі на тэму: «Тавар» **на яўрэйскай мове,** для яўрэйскай ЗОШП.

2-IX.—«Аб агітацыі на вёсны, яе задачах і падрах». Лекцыя тав. **Нікіціна.**

9-IX.—«Асноўныя рысы капіталістычнага спосабу вытворчасьці». Лекцыя тав. **Леонцьева.**

16-IX.—«Паглыбленьне сусьветнага крызісу і задачы Камінтэрну». Лекцыя тав. **Іоэльсона.**

23-IX.—«Ленінская тэорыя імпэрыялізму». Лекцыя **Леонцьева.**

4. ЦЫКЛЯВЫЯ РАДЫЁ-ЛЕКЦЫІ ДЛЯ ЎСІХ ФОРМ ЗАВОЧНАЙ ПАРТАСЬВЕТЫ.

3, 10, 15, 21, 28 верасьня. Цыкль лекцый тав. **Мануілава** на тэму: «**Барацьба на два фронты ў гісторыі партыі».** (У барацьбе з якімі ворагамі ўнутры рабочага руху вырас, умацнеў і ўмацаваўся бальшавізм).

ЦЫКЛЬ ЛЕКЦЫЙ «НАЦПАЛІТЫКА СССР».

4-IX.—«Ажыцьцяўленьне ленінскай нацпалітыкі ў БССР». Лекцыя тав. **Хэлепа.**

14-IX.—«Барацьба партыі за лікідацыю гасподарчай і культурнай вароўнасьці народаў СССР і праблема нацкультуры на сучасным этапе». Лекцыя тав. **Машонкіна.**

26-IX.—«Барацьба за ленінскую нацыянальную палітыку ў гісторыі нашай партыі». Лекцыя **т. Аржанава.**

5. ЛЕКЦЫІ ПА ПЫТАНЬНЯХ БЯГУЧАЙ ПАЛІТЫКІ ДЛЯ ЎСІХ ФОРМ ЗАВОЧНАЙ ПАРТАСЬВЕТЫ. (Эпізодычныя)

8-IX.—«Падрыхтоўка транспарту да асенняй-зімовых перавозак».

17-IX.—«Аб ахове дзяржаўнай і грамадзкай маемасьці».

20-IX.—«Задачы перабудовы літаратурна-мастацкай работы у сувязі з пастановамі ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б».

22-IX.—«Аб парадку разьмяркаваньня даходаў 1932 г. ў калгасах».

27-IX.—«Аб рэалізацыі дырэктыў партыі і ўраду па выкананьні пляну заготовак і разгорнуваньня калгаснага гандлю».

6. ІНСТРУКЦЫЙНЫЯ ПЕРАДАЧЫ ДЛЯ РАБОТНІКАЎ СЫСТЭМЫ ЗАВОЧНАЙ ПАРТАСЬВЕТЫ, ПРАПАГАНДЫСТАЎ І КАН СУЛЬТАНТАЎ

5-IX.—«Сыстэма вучэбнай работы ў завочным партнавучаньні і мэтады кіраўніцтва ёю». Лекцыя тав. **Мінчанка.**

11-IX.—Падрыхтоўка прапагандыстаў да заняткаў. Лекцыя тав. **Кана.**

Дырэктар ІМЗО пры ЦК КП(б)Б
ЗАЛАТУХІН.

АДРАС: Інстытут Масавага Завочнага Навучаньня партактыву пры ЦК КП(б)Б. Гор. Менск, дом Камасьветы, пакой 6, тэлеф. 6—34.

СКОРА!
НОВЫ ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ
ГАЙЛЬ МОСКАЎ
НЯХАЙ ЖЫВЕ МАСКВА.

Плянава-Эканамічны Вучэбны Камбінат паведамляе, што ПРЫЁМ (у Інстытут, Тэхнікум і Рабфак) ПРАЦЯГНУТ ДА 15 ВЕРАСЬНЯ г. г.
Дырэктар Камбінату А. Гурло.

Чырвоная Зорка Пач.: 5-30, 7-15, 9, 10-45. Кас.—ад 4 г. Вясёлая канарка драма ў 6 частках. Кіно-хроніка Саюзкіно.
„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“. Мастацкі фільм АСАБНЯК ГАЛУБІНЫХ Звыш пр.—Кіно-хроніка Саюзкіно
„Прелетары“ Гарольд Лёйд у замежнай камэдыі НА СЁМЫМ НЕБЕ. Дзённыя дзіцячыя сэансы мастацкі фільм З ПАРАДА З
„СПАРТАК“ Пач.:7-15, 3-15, 9-30, 10-45. Кас.—ад 5 г. З-я апошняя сэрыя МІСМЭНД у 6 частках.

Беларускі дзяржаўны мэханіка-машына-будаўнічы інстытут у Гомелі
—— абвяшчае ——
АСЕНЬНІ НАБОР на 1-шы курс „адзяленьняў:
1) халоднай апрацоўкі мэталяў, 2) гарачай апрацоўкі мэталяў, 3) канструкцыі с.-г. машын, 4) станкабудаўніцтва, 5) мэханізацыі сельскай гаспадаркі, па спэцыяльнасьцях: халоднай апрацоўкі мэталяў, гарачай апрацоўкі мэталяў і канструкцыі с.-г. машын
Апрача дзённых груп арганізуюцца вячэрнія групы, на якіх студэнты будуць вучыцца без адрыву ад вытворчасьці.
У заявах трэба паказаць, на якую спэцыяльнасьць жадае паступіць і з адрывам ці без адрыву ад вытворчасьці.
Прыём заяў да 20 верасьня.
Да заяў неабходна прыдалсьці: пасьведчаньне аб адукацыі (арыгінал), даведку аб узросьце (арыгінал), аб сац. становішчы паступаючага і яго бацькоў, для калгаснікаў—аб тэрміне уступленьня ў калтас, для сялян—акладны ліст, даведку аб стане здароўя, аб адносінах да вайсковай павінасьці, засьведчаную анкету, дзьве фота-карткі і на 45 к. паштовых марак для адказу. Заявы накіроўваць па адрасе: г. Гомель, Кавпэрацыйная, 68, Мэханічнаму Інстытуту.
Дырэктар інстытуту Лысоў.

Беларускі Дзяржаўны Інстытут Савецкага Будаўніцтва і Права прапануе студэнтам 2 і 3 курсаў дзённага і вячэрняга факультэтаў зьявіцца на заняткі 1 верасьня 1932 г.
Нам. дырэктара Рудзіцкі. Сакратар Тарасік.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ САВЕЦКАГА БУДАЎНІЦТВА І ПРАВА
пры прэзыдыуме ЦВК БССР
—— АБВЯШЧАЕ ——
АСЕНЬНІ НАБОР СТУДЭНТАЎ
НА НАСТУПНЫЯ АДДЗЯЛЕНЬНІ:
1. Аддзяленьне САВЕЦКАГА БУДАЎНІЦТВА
Рыхтуе і перападрыхтоўвае кіруючы склад і адказных работнікаў райвыканкомаў, гарсаветаў, пасёлкавых саветаў гарадзкога тыпу, адказных работнікаў сэкцый і частак савецкага будаўніцтва цэнтральных устаноў і органаў РСІ.
2. Аддзяленьне СУДОВА-ПРАКУРОРСКАЕ
Рыхтуе і перападрыхтоўвае следчых, судзьдзяў, пракурораў і адказных работнікаў цэнтральнага апарату НКЮ, а таксама работнікаў, органаў ДПУ.
3. Аддзяленьне РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКАЕ
Рыхтуе і перападрыхтоўвае рацыяналізатараў кіраўніцтва і арганізатараў рацыяналізатарскае справы для адміністрацыйных і гаспадарчых устаноў і органаў РСІ.
Кожнае аддзяленьне мае дзённую і вячэрнюю групы.
Працяг вучобы на ўсіх аддзяленьнях тры гады.
Заявы прымаюцца да 15 верасьня 1932 г.
Заняткі з новым наборам пачнуцца 1 кастрычніка 1932 г.
У матар'яльных адносінах студэнты дзённага факультэту забясьпечваюцца на тых-жа правах, як і студэнты Камвузу.
У інстытут прымаюцца асобы, якія маюць:
а) ня менш чым двухгадовы вытворчы стаж у прамысловасьці ці сельскай гаспадарцы, або практычны стаж працы ў дзяржаўных, грамадзкіх, або кааперацыйных установах,
б) сярэднюю адукацыю.
У паасобных выпадках могуць быць прыняты асобы, якія і на маюць сярэдняй адукацыі, але калі яны па сваім практычным разьвіцьці і ўзроўні агульных ведаў задаволь ць патрабаваньням інстытуту.
Апрача таго абвяшчаецца набор на падрыхтоўчае аддзяленьне, якое мае сваёй мэтай падрыхтаваць для паступленьня ва першы курс інстытуту таварышоў з практычных работнікаў пізавога савецкага апарату, якія ня маюць сярэдняй адукацыі, але маюць вопыт практычнай работы і агульнае палітычнае разьвіцьцё.
Тэрмін навучаньня на падрыхтоўчым аддзяленьні—адзін год.
Слухачы падрыхтоўчага аддзяленьня поўнасьцю забясьпечваюцца стыпэндыяй Інтэрнатам.
Прыём заяў—да 15 лістапада 1932 г.
Пачатак заняткаў—1 студзеня 1933 г.)
Да заявы (з паказаньнем аддзяленьня павінны быць далучаны наступныя дакумэнты:
а) анкета для паступаючых у ВНУ, засьвердженая адпаведнымі органамі;
б) пасьведчаньне аб асьвеце;
в) даведка аб стане здароўя;
г) копія вайсковага білету (для мужчын).
Пажадана мець водзывы аб працы, як савецкай так і грамадзкай.
Адрас Інстытуту: Менск, Унівэрсытэцкі гарадок, Інстытут Саўбуд і Права.
Загадчык Аддзелу Кадраў Прэзыдыуму ЦВК БССР Е. Майзіт.
Нам. Дырэктара Інстытуту Рудзіцкі.

Адкрыт прыём у Полацкі пэдагагічны тэхнікум і дашкольны тэхнікум і аднагадовыя пэдкурсы.
Скончыўшыя 7 годку прымаюцца бяз іспытаў.
Студэнты забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам. Заявы і дак